беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Аднoўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

# НАША НІВА

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

№ 5 (43)
8 красавіка 1996 г.
панядзелак

ТЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

*Станіслаў Шушкевіч:*

## "НАШ ПРЭЗЫДЭНТ – ГЭТА СТАРЭЙШАЕ ПАКАЛЕНЬНЕ, ЯКОЕ ЎЖО АДЧУВАЕ СВОЙ ВЕК"

*Карэспандэнт "Нашай Нівы" Алег Дашкевіч зьвярнуўся да Станіслава Шушкевіча з просьбаю пракамэнтаваць апошнія падзеі ў Беларусі.*



**"НН": Як Вы ацэньваеце сытуацыю ў краіне сёньня: з аднаго боку падпісаныя пагадненьні з Масквой, зь іншага — адбыліся такія акцыі пратэсту, якіх не было зь 91-га году?**

С.Ш.: Вельмі проста ацэньваю. Гэтыя пагадненьні — прэвэнтыўны захад прэзыдэнта, каб захаваць нейкі, на ягоную думку, прыстойны выраз твару ў сытуацыі, калі ўсё валіцца з рук. Эканоміка ў нас развальваецца, а прэзыдэнт толькі цяпер зразумеў, што такое макрапаказчыкі. Яму ўбівалі ў галаву, што макрапаказчыкі ў нас добрыя. Між тым галоўны зь іх — валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва — у нас усё меншы й меншы. Летась мы разьмінуліся з Польшчай. Калі ў савецкія часы наш валавы ўнутраны прадукт быў амаль удвая большы (паводле адной мэтодыкі ацэнкі), то цяпер ён складае 2.300 даляраў на чалавека, а ў Польшчы 2.700. У іх павышаецца, а ў нас падае.

Прэзыдэнт нічога ня здольны зрабіць з гаспадаркай, бо проста не ўсьведамляе, што такое аб'ектыўныя эканамічныя законы, і таму робіць такія захады, якія б паказвалі, што ён клапоціцца пра грамадзтва. Аднак спадзявацца, што, дзякуючы палітычнаму і — падкрэсьлю — ваеннаму саюзу з Расеяй, у нас нешта палепшыцца, нельга. Што да эканомікі, то ніякіх перашкодаў для ўзаемадзеяньня з Расеяй у нас і не было. Так што я бачу гэтую акцыю як зьнявагу беларускай дзяржаўнасьці, беларускай годнасьці.

Адбываецца фармальнае ўсталяваньне праваслаўя як адзінай дзяржаўнай рэлігіі, што пярэчыць нашаму заканадаўству. У свой час мы прынялі добрыя законы, каб не супрацьпастаўляць людзей розных канфэсіяў, якія жывуць тут спрадвеку. А цяпер я ўжо ня ведаю, што рабіць... Я лічыў, што тая зьнявага рэлігіі, якая была ў савецкі час, павінна кампэнсавацца добрым стаўленьнем да ўсіх канфэсіяў. Калі выбіраць нейкую адну як дзяржаўную, што фактычна цяпер і робіцца, мяркуючы хаця б з рытуалу падпісаньня, то гэта значыць толькі павялічваць супрацьстаяньне ў грамадзтве. Мы йшлі да іншага жыцьця, да адкрытага грамадзтва і ўсё для гэтага рабілі. Але не пасьпелі зрабіць і адзін крок, як ізноў нас цягнуць у камуністычны рай.

**"НН": Чым выклікана тое, што мы не пасьпелі?**

С.Ш.: У дзяржаўных справах нельга нешта рабіць вельмі хутка, можна наламаць дроваў. А перашкода ўзьнікла таму, што ў нас выхаваўся homo soveticus, жыхар камунальнай кватэры. Адсюль гэтае "сообщество". На беларускую мову яно не перакладаецца. У нас прыстойная мова, а "сообщество" можа быць і "порядочное" і "преступное". У беларускай мове такога слова я ня ведаю. "Сообщество" сувэрэнных рэспублік. І адразу зьяўляецца абрэвіятура ССР. Нехта марыць пра гэты ССР. Паглядзіце, што рабілася на афіцыйным мітынгу. Сотня аўтобусаў... Павыцягвалі старых людзей, пра якіх трэба было б клапаціцца, а не вазіць іх з партрэтамі Леніна... Заблыталі ўсё і ўсяк.

Стыхійны мітынг быў большы, значна маладзейшы, значыцца ён пэрспэктыўны. Старэйшае пакаленьне моцна заблыталася. Я б не адносіў нашага прэзыдэнта да старэйшага пакаленьня, але паводле свайго мысьленьня — гэта старэйшае пакаленьне, якое ўжо адчувае свой век. Таму я спадзяюся на моладзь, на праблескі гістарычнае праўды, дарэчы, дзякуючы і вашай газэце...

**"НН": Вы ўзначальвалі дзяржаву. На сёньняшні погляд — ці былі ў Вас буйныя памылкі?**

С.Ш.: Чалавек, які лічыць, што ён не рабіў памылак — гэта несур'ёзны чалавек. Але адразу хачу Вас падправіць. У Беларусі толькі з увядзеньнем прэзыдэнцтва зьявіўся чалавек, які лічыцца галавою дзяржавы, раней такой асобы мы ня мелі. Я быў старшынём Вярхоўнага Савету. І фактычна правоў у мяне было гэтулькі ж, колькі ў сьветлай памяці Максіма Танка, калі ён узначальваў ВС, у Шамякіна, у Навуменкі.

*Працяг на старонцы 2*

# Аднаўленьне Рэспублікі



2 красавіка 1996 году пад націскам варожых сілаў пала Рэспубліка Беларусь.

І хоць расейскія танкавыя калёны не ўрываліся ў сталіцу краіны, але юрыдычна ўсе прыкметы акупацыі навідавоку. Спынена дзейнасьць Канстытуцыі краіны і тых законаў, якія ўсталёўвалі статус незалежнае дзяржавы, спынены кантроль легітымных органаў Рэспублікі над зьнешняй і ўнутрнай палітыкай краіны, эканамічнае жыцьцё рэгулюецца таксама не беларускім заканадаўствам, а — пад прыкрыцьцём мытнага саюзу — расейскімі дзяржаўнымі інстытуцыямі. Актыўнасьць мясцовых калябарантаў толькі падкрэсьлівае спэцыфіку акупацыі — Расея пагадзілася з ініцыятывамі сваёй крэатуры. Жэнэўская канвэнцыя 1949 г. "Пра абарону цывільнага насельніцтва" разглядае й такія варыянты акупацыі, калі захоп тэрыторыі іншае дзяржавы не суструэў узброенага супраціву.

Я меркаваў, што 2 красавіка стане днём нацыянальнае ганьбы. Але тое, што адбылося ў Маскве, нагадвала абсурд, а падзеі ў Менску былі ўзьнёслымі.

Сцэна на "Красном крыльце" маскоўскага Крамля поўнілася камэдыйнымі эпізодамі: расейскі трыкалёр накідваўся на твар Ельцыну; капеж трапляў за каўнеры беларускае дэлегацыі, ад чаго яе ўдзельнікі ніяк не маглі ўстаяць на месцы; Лукашэнка адыходзіў ад пратаколу ды зрываўся, трацілу сваёй прамовы ён прысьвяціў пераконваньню расейцаў у тым, што людзі ў Беларусі, якія не пагаджаюцца з акупацыяй сваёй краіны, робяць гэта з-за няведаньня.

Падзеі 2 красавіка сфармулявалі, апрач іншага, праблему статусу расейскага праваслаўя ў Беларусі. Маскоўскі патрыярхат ня можа паразумецца зь іншымі праваслаўнымі цэрквамі сьвету — бо прагне лідарства. РПЦ усё шчыльней зрастаецца з расейскаю дзяржаваю, пранікае ў войска, у сыстэму адукацыі; уцягваецца ў палітыку й гэтым самым здраджвае прынцыпам царкоўнае незалежнасьці.

*Працяг на старонцы 2*

***Гэтым разам у рубрыцы "Цана культуры" гісторык Міхась Чарняўскі з дакумэнтамі ў руках распавядае пра тое, як у 1986-м годзе ў Траецкім прадмесьці афганскія вэтэраны зьбілі вучняў Менскай школы-інтэрнату імя Ахрэмчыка за тое, што дзеці сьпявалі беларускія песьні ды гаварылі міжсобку па-беларуску. Білі, нацкаваныя гаркамам камсамолу, білі ў згоднай прысутнасьці міліцыі...***

*Старонка 3*

ТЭМА

## ЗВЫЧАЙНЫ ФАШЫЗМ-2

Тэмай гэтага нумару "Нашай Нівы" стала ня надта заўважная, але надта небясьпечная зьява ў сёньняшнім нашым грамадзтве. Фашызм. Пры гэтым гутарка вядзецца не столькі пра псыхалёгію, колькі пра структуры сучасных скрайне правых расейскіх арганізацыяў, якія разгортваюць сваю дзейнасьць у Беларусі. Багаты на факты нарыс журналіста Славаміра Адамовіча знаёміць таксама з гісторыяй сусьветнага і расейскага фашысцкага руху, з сучаснымі праявамі нэафашызму ў Эўропе і сьвеце.

*Старонкі 4-5 і 20-21*

## навіны 1 радком...........

**СВАБОДА СЛОВА.** Расейскі Фонд Абароны Галоснасьці заявіў, што беларуска-расейская дамова пра ўтварэньне "Сообщества" не забясьпечвае інфармацыйнай свабоды. "Застаецца незразумелым, як асьвятляць падзеі: паводле прынцыпаў свабоднай расейскае прэсы, ці цалкам падкантрольнай прэзыдэнту беларускай", — гаворыцца ў заяве Фонду.

**ВІЗЫ.** З 1 красавіка візы на ўезд у Літву зьменяць свой зьнешні выгляд. Новыя візавыя маркі маюць 20 ступеняў абароны і дызайнам падобныя да марак краінаў Шэнгенскага пагадненьня.

**СЬВЯТЫ.** Кабінэт Міністраў пастанавіў перанесьці працоўныя дні з панядзелка 22 красавіка на суботу 20 красавіка і зь пятніцы 10 траўня на суботу 4 траўня.

**ПАГРОЗА.** Аляксандар Лукашэнка на сустрэчы з журналістамі паабяцаў звольніць з працы выкладчыкаў ВНУ, якія, паводле ягоных зьвестак, заклікалі студэнтаў да ўдзелу ў акцыі пратэсту 2 красавіка.

**АРЫШТЫ.** Напрыканцы мінулага тыдня ў Казахстане пачаліся арышты тых грамадзянаў рэспублікі, якія пікетамі падтрымалі рашэньне Дзярждумы Расеі аб дэнансацыі Белавескае дамовы. Казахстанскія суды кваліфікуюць іхныя справы як заклікі да гвалтоўнае зьмены Канстытуцыі.

**ІМЁНЫ.** Адначасова прэзыдэнт Казахстану выдаў Указ аб вяртаньні імёнаў казахаў да іхных спрадвечных формаў — адбудзецца дэрусіфікацыя казахскай анамастыкі.

**ГЕАГРАФІЯ.** Вучоныя-геадэзісты вызначылі геаграфічны цэнтар Беларусі. Ён знаходзіцца ў сямі кілямэтрах на захад ад Мар'інай Горкі, каля вёсак Бор і Антонава.

**ЖАБКІ.** Швэйцарская грамадзкасьць занепакоеная — пачалася чарговая веснавая міграцыя жабак, якія велізарнымі калёніямі перапазяць праз аўтастрады. Каб ўратаваць амфібіяў, паліцыя вымушана выстаўляць мабільныя патрулі дзеля своечасовага спыненьня дарожнага руху. Уладам дапамагаюць грамадзкія арганізацыі.

# Аднаўленьне Рэспублікі

Працяг са старонкі 1

РПЦ усклала на сябе адказнасьць за ідэалягічную санкцыю на акупацыю нашае краіны. Гэтым самым з новаю сілаю зазначана неабходнасьць вызваленьня праваслаўя Беларусі ад расейскай залежнасьці. Бізантыйскае сьвята цэзарапапізму, што было наладжанае ў маскоўскім Крамлі, сярод вычварнай і неэўрапейскай архітэктуры, маніфэстацыя тэакратычнай дзяржаўнай ідэі, калі рызы чаргаваліся з мундурамі, — гэта пагроза нашаму сьвецкаму грамадзтву, дзе рэлігія фармуе сфэру маральнага традыцыяналізму, а асобныя дэнамінацыі ня мусяць быць прывілеяванымі.

Пад вечар у Крамлі наладзілі банкет на некалькі тысячаў асобаў. А тым жа часам у Менску масавая маніфэстацыя запоўніла вуліцы гораду. 2 красавіка ў акцыях пратэсту брала ўдзел пераважна моладзь.

2 красавіка пратэставалі і ў Баўгарыі. Пераадольваючы ранейшы комплекс непаўнавартасьці, тысячы баўгараў выйшлі на акцыі пратэсту супраць выказваньня Б.Ельцына наконт таго, што да "Дамовы пра паглыбленую інтэграцыю" Беларусі, Расеі, Казахстану й Кыргыстану магла б далучыцца і Баўгарыя.

Зноў паўтараецца стрыжнявы сюжэт гісторыі Сярэдняй Эўропы — пошук сваёй ідэнтычнасьці й адстойваньне сваёй адрознасьці. Ва ўмовах XX ст. вонкавая агрэсія супраць краінаў рэгіёну азначала для іх пагрозу існаваньню самога тыпу цывілізацыі.

Цяпер, з вышыні колькіх прамінулых дзён, якія сталі часам адліку новае геапалітычнае сытуацыі, з вышыні ўжо гістарычнага досьведу й часу, мы можам казаць пра гістарычны вобраз Рэспублікі Беларусі. Першыя 2-3 гады незалежнасьці гэта была дзяржава, у якой:

1) распачыналіся эканамічныя рэформы, што надавала сацыяльны аптымізм;

2) забясьпечваліся грамадзянскія правы, свабода слова, вызнаньняў, пачынаў усталёўвацца незалежны суд;

3) урад прытрымліваўся палітыкі нэўтралітэту; у войску служылі 1,5 гады, а плянавалася скараціць тэрмін службы да 1 году;

4) нацыянальная ідэнтычнасьць выйшла з падпольля.

Гэта той станоўчы вобраз дзяржавы, які застанецца ў нашай памяці й які мы будзем трансьляваць праз розныя інфармацыйныя крыніцы. Станоўчы гістарычны вобраз — гэта адзін з чыньнікаў кансалідацыі беларускага грамадзтва.

Працэсы высьпяваньня нацыі і будовы ўласнае дзяржавы зайшлі ў Беларусі гэтак далёка, што пакорлівай і бесканфліктнай капітуляцыі не прадбачыцца. Ня выключана ірляндызацыя канфлікту, узьнікненьне тэрарызму, пераўтварэньне Беларусі ў нестабільны рэгіён. Але вызначальным будзе той мірны супраціў, які здолее наладзіць беларускае грамадзтва: менавіта ў мірныя формы абароны сваёй дзяржавы ўцягваецца найвялікшая колькасьць людзей; мірныя формы супраціву ў малым адрэзку часу не характарызуюцца высокай эфэктыўнасьцю, але ў гістарычнай пэрспэктыве — гэта глябальны працэс; мірныя формы стваральныя — узьнікаюць і разьвіваюцца новыя незалежніцкія інстытуцыі й газэты, выхоўваюцца новыя пакаленьні, фармуецца нацыянальны бізнэс, тутэйшыя людзі трапляюць у сярэднюю й вышэйшую чынавенскую клясу... Надыходзіць час, калі застаецца толькі памяняць кукарды.

Рэжым, умовы і наступствы акупацыі вызначаны ў Гагскіх (1899, 1907) і Жэнэўскай (1949) канвэнцыях. Міжнароднае заканадаўства дае права народам акупаваных краінаў захоўваць вернасьць сваім дзяржавам. Ігнараваньне распараджэньняў акупацыйных уладаў — адна з формаў такой вернасьці. Адначасова акупацыйная дзяржава, паводле міжнароднага заканадаўства, павінна рабіць захады дзеля ўпарадкаваньня цывільнага й гаспадарчага жыцьця на захопленай тэрыторыі ў інтарэсах цывільнага насельніцтва.

Існуе мноства формаў арганізацыі мірнага супраціву. Для Беларусі сёньня асобую актуалію набываюць дзьве — стварэньне Камітэтаў грамадзянаў і Грамадзкага Трыбуналу.

Яшчэ напрыканцы кіраваньня Кебіча ў Беларусь быў закінуты расейскі дэсант службоўцаў. Гэтая структура паступова перайшла ў органы кіраваньня Лукашэнкі. Каб адрозьніць гэтую наплылую масу ад законных носьбітаў суверэнітэту, якімі юрыдычна ёсьць беларускія грамадзяне, неабходна структурна аформіць рознасьць юрыдычных статусаў — грамадзянаў, паводле беларускага закону пра грамадзянства, і неграмадзянаў (у тым ліку тых, каму грамадзянства было нададзена незаконна). Прыкмета акупацыі — калі апошняя катэгорыя людзей вызначае палітыку дзяржаўных органаў кіраваньня. Дзейнасьць Камітэту беларускіх грамадзянаў — гэта таксама абарона свайго статусу перад спробамі ліквідацыі беларускага грамадзянства праз "падвойнае грамадзянства" ці "грамадзянства ССР".

Неабходна распачаць дакумэнтаваньне злачынстваў рэжыму, публікацыю рэестру гэтых злачынстваў ды публікацыю прававых ацэнак. Юрыдычная база дзеля гэтага ёсьць — Канстытуцыя і законы Беларусі. Першы этап збору такой інфармацыі вельмі просты — ужо маюцца пастановы Канстытуцыйнага Суда наконт указаў Лукашэнкі, а таксама зафіксаваныя факты парушэньняў гэтых пастановаў і самой Канстытуцыі. Вяршыня дзейнасьці Грамадзкага Трыбуналу — гэта грамадзкі суд над галоўнымі асобамі акупацыйна-таталітарнага рэжыму й перадача ўсіх матэрыялаў у юрыдычна правамоцны суд, які ў пэрспэктыве будзе сфармаваны, магчыма, і міжнароднымі інстанцыямі.

Дзейнасьць двух грамадзкіх утварэньняў — Камітэту грамадзянаў і Грамадзкага Трыбуналу, — забясьпечвае для аднаўленае Беларускае дзяржавы прававую пераемнасьць і гістарычнае абгрунтаваньне. Таму лёзунгі беларускага грамадзтва —"Вяртаньне Канстытуцыі" і "Аднаўленьне Рэспублікі".

Алег Дзярновіч

# "НАШ ПРЭЗЫДЭНТ — ГЭТА СТАРЭЙШАЕ ПАКАЛЕНЬНЕ..."

Працяг са старонкі 1

Тая ж самая канстытуцыя працавала. У мяне зьявілася толькі адно дадатковае права – падпісваць міжнародныя пагадненьні. І вось калі мне нехта скажа, што я гэтае права выкарыстаў дрэнна альбо недзе не скарыстаў, я пакрыўджуся. А што да ўнутраных справаў, то я ня ведаю, што зрабіў сёньняшні старшыня ВС і што ён зробіць. Ён фактычна вярнуўся да тых самых правоў. Таму што цяпер над ім ёсьць прэзыдэнт, так, як раней быў ЦК КПБ. Дык вось я быў у такіх умовах, калі зьнік ЦК КПБ і была канстытуцыя, якая не давала ніякіх правоў старшыні ВС. І пры супрацьстаяньні ўраду, большасьці ВС і прэзыдыюму ВС, якія мяне абралі ў пачуцьці страху, – мне трэба было штосьці зрабіць для Беларусі. За гэты пэрыяд я зрабіў менш, чым хацеў, але больш, чым мог. Для большага трэба было парушаць законы. Але сёньня мне ніхто ня можа сказаць: вось Лукашэнка парушае Канстытуцыю, парушае законы, дык і ты ж парушаў. Таму што я лічыў, калі ўжо мы пачалі будаваць прававую дзяржаву, то ў якіх бы ты цяжкіх умовах ні быў, выпраўляй законы, садзейнічай іх выпраўленьню, але не парушай.

Што нас прывяло да цяперашняга стану? Адсутнасьць цярпеньня ў Вярхоўным Савеце. Мы пасьлядоўна прымалі новую Канстытуцыю. І больш за сто артыкулаў было прынята пад маім старшынствам. Некалькі артыкулаў – пальцаў адной рукі хопіць пералічыць – было прынята пад кіраўніцтвам Грыба. А астатняе – фактычна без кіраўніцтва. Нашы маладыя палітыкі так хацелі атрымаць новую Канстытуцыю, а камуністычная большасьць так бачыла прэзыдэнтам Кебіча, што 38 артыкулаў прынялі адным скокам. І ўсе складанасьці, якія маем – ад несбалянсаванасьці, ад недакладнасьці фармулёвак менавіта гэтых 38-мі артыкулаў. Не хапіла цярпеньня і мужнасьці папрацаваць яшчэ паўгода-год. І тады б ніякіх непаразуменьняў не было. А сёньня выпраўляць сытуацыю вельмі цяжка. Можна зразумець і Польшчу, і Украіну, якія дагэтуль ня маюць канстытуцыі, бо яны вельмі сур'ёзна да гэтага ставяцца.

**"НН": Вы, як ніводзін беларускі палітык, карысталіся павагай на Захадзе...**

С.Ш.: У мяне й цяпер на стале – звароты і запрашэньні ад літоўскіх, украінскіх, расейскіх парлямэнтароў. Запрашалі ў Швэцыю, Нямеччыну, Брытанію... На няўвагу я ня скарджуся. Але хачу адразу сказаць: я не заваёўваў аўтарытэт тым, што гандляваў інтарэсамі Беларусі, альбо, наадварот, лез у бутэльку, каб зацьвердзіць нейкія беларускія пазыцыі насуперак той сытуацыі, якая склалася ў грамадзтве. Я не сьпяшаўся. Вельмі часта гавораць, што чыстымі рукамі палітыку рабіць нельга. Гэта найвялікшая памылка. Мне невядомы ніводзін буйны замежны палітык з бруднымі рукамі (можа, акрамя таталітарных). Там такія людзі не застаюцца пры ўладзе. Напрыклад, каб прэзыдэнт парушыў канстытуцыю – прабачце... Альбо каб хлусіў на ўсю рэспубліку ў тэлебачаньні... Альбо каб не прынёс прабачэньня, калі памыліўся... Такога не бывае. Такое толькі ў нас. Але я думаю, што і ў нас няма такіх традыцыяў. Гэта савецкія традыцыі, калі хлусьня была афіцыйным дзяржаўным сродкам.

**"НН": Маючы добры палітычны капітал, як Вы ўяўляеце сваю палітычную будучыню?**

С.Ш.: Я сказаў бы так: многія людзі марацЬ пра такую палітычную мінуласьць, якая была ў мяне.

Пра сваю палітычную будучыню трэба казаць, калі ёсьць пэўныя ідэі. У мяне такія ідэі ёсьць – што рабіць у Беларусі ў наш цяжкі цяперашні момант. Але для таго, каб гэта зрабіць, трэба пераканаць большасьць ВС. Ведаеце, я магу займацца мітынговай палітыкай значна лепей за многіх, але лічу, што гэта не для мяне справа. Калі мяне абралі дэпутатам ВС, я павінен працаваць для таго, каб наша заканадаўства, якое ні ёсьць, удасканальвалася і выконвалася. Сёньня я маю канкрэтную працу ў Камісіі эканамічнай рэформы. Таксама я магу быць карысны многім дэпутатам для ўзаемадзеяньня... Што да рашучых дзеяньняў з боку ВС, то я іхны прыхільнік. Але калі тылы не забясьпечаныя, калі для такой мэты не сабралася большасьць – гэта бессэнсоўна.

**"НН": Вы заўсёды былі проста дэмакратам. У Вас былі прыхільнасьці да сацыял-дэмакратычнага руху, але Вы сталі сябрам фракцыі "Грамадзянскае Дзеяньне". Увогуле, зь якой палітычнаю сілай краіны Вы зьвязваеце сваю палітычную будучыню?**

С.Ш.: Я й сёньня перакананы, што для тых умоваў, у якіх існуе Беларусь, яе грамадзтва, для мэнтальнасьці беларусаў найбольш адпавядае клясычная сацыял-дэмакратыя. Таму паводле перакананьняў я бліжэй за ўсё да БСДГ. Але я не ўваходжу ні ў якую партыю. Рэч у тым, што пэўныя асобы ў с.-д. фракцыі "Саюз Працы" зрабілі такія ўчынкі, якія несумяшчальныя з маім сумленьнем, з маім падыходам да справы. Я не магу быць у фракцыі, кіраўнікі якой заяўляюць, што мы мусім зрабіць легітымным парлямэнт, які паводле Канстытуцыі нелегітымны і заклікаюць прэзыдэнта зацьвердзіць гэта сваім указам. Я не ўваходжу і ў Аб'яднаную Грамадзянскую Партыю, але цалкам падзяляю тую пляцформу, якая аб'яднала дэпутатаў у фракцыю "Грамадзянскае Дзеяньне". Гэта вельмі простая пляцформа: канстытуцыйнасьць, дзяржаўнасьць і сацыяльна арыентаваная рынкавая эканоміка. Наагул, у нармальнай дзяржаве не існуе праблемы дзяржаўнасьці, а ў нас яна існуе. І таму на гэтым этапе я ўваходжу ў "Грамадзянскае Дзеяньне". У мяне няма, як кажуць, кампрамату, ні на аднаго чалавека з гэтай фракцыі. Мне прыемна зь імі супрацоўнічаць. Гэта палітычная, эканамічная, фінансавая эліта нашага грамадзтва, прыстойныя людзі. І калі б гэтай фракцыі яшчэ крышку больш беларускасьці, яна б на сто працэнтаў адпавядала майму разуменьню таго, якімі павінныя быць палітыкі.

**"НН": На наступных прэзыдэнцкіх выбарах, я думаю, знойдзецца дастатковая колькасьць людзей, якія вылучаць Вашу кандыдатуру... Ці думаеце Вы пра прэзыдэнцтва?**

С.Ш.: Дрэнны той салдат, які ня хоча быць генэралам, але яшчэ горшы той, які выходзіць перад усімі і б'е сябе ў грудзі, маўляў, я хачу быць генэралам. У Беларусі распаўсюджаны цэлы шэраг пэўных ідэалягічных антытэзаў супраць мяне асабіста. На гэта працавала каманда Кебіча і такія выдатныя яе члены як Замяталін, як Антановіч. Яны прадаліся цяпер другой галіне ўлады, і будуць ганіць таго самага Кебіча – ім усё адно, бо гэта платныя правакатары. Але ў барацьбе са мною яны дасягнулі вялікіх посьпехаў, бо працавалі ў ідэалягічнай службе ЦК КПБ і КПСС і ведаюць, якую можна пусьціць чутку, каб пэўныя колы дрэнна ставіліся да чалавека.

Я лічу, што на наступных выбарах павінен быць вылучаны адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў. Вылучэньне павінна грунтавацца на добрых сацыялягічных дасьледаваньнях і на разуменьні тэндэнцыяў разьвіцьця. Я навуковец і не магу выступаць на ненавуковай падставе. У мяне хопіць мужнасьці падтрымаць меней вядомую кандыдатуру, якая мае большыя шанцы на абраньне, чым я. І хопіць мужнасьці адстаяць сябе, калі я буду бачыць, што можна гэты працэс павярнуць на сваю карысьць.

**"НН": Што тычыцца ўвогуле дэмакратычнага руху ў Беларусі. Як Вы ацэньваеце сытуацыю пасьля паразы, якой стаўся рэфэрэндум?**

С.Ш.: Казаць, што рэфэрэндум – гэта параза дэмакратычнага руху нельга. У свой час я цешыўся, што мы прынялі Закон аб рэфэрэндуме. У нас сьвядомая частка грамадзтва – гарады, і яны прагаласавалі за нашу беларускую сапраўдную сымболіку. А ўведзеная ў зман правінцыя – інакш. Таму гэта не была параза дэмакратыі. Але цяперашні адкат можа прывесьці да такой паразы. Бо сродкі масавай інфармацыі, як і раней, у руках малапрыстойных людзей – паглядзіце колькі хлусьні...

**"НН": І ўсё ж 30 тысячаў выходзяць на вуліцу, нягледзячы на агітацыю...**

С.Ш.: Дык Вы гаворыце пра Менск. А гэта – увесь горад – палітычная эліта краіны. Тут можна набыць і "Свабоду" і "Нашу Ніву". А паспрабуйце набыць у Даўгінаве або ў Будславе. Іншая думка там мае зусім малое пашырэньне.

# Рыбалка

Смачней за ўсё выглядае прынада. Хто з нас ня бачыў, як цокаюць языкамі вудалі, перабіраючы параны гарох, апарышаў ці жыўцоў! Прынада павінна паралюшаваць волю ахвяры...

Калі 2 красавіка ў Крамлі на "крыльцо" выйшлі Лукашэнка, Ельцын ды Алексій, я ўзгадаў рыбалку...

Адвечна зблытаны пук жылкаў, старыя пярэстыя плыўкі, званочкі, парэпаныя іржою, грузільны з расьпілаванага шроту й салідныя бумбялочкі на донку, кручкі, якія штораз імкнуцца падрапаць пальцы, злыя, у парэштках леташняга чарвяка...

Гляджу ў экран — поўная блытаніна. Хто і з кім цалуецца, з чым віншуюць? Што робіць там патрыярх? Што за людзі зьбіліся на ганку? Пры чым тут ківэры на галовах ганаровае варты? На што намякаюць?..

Рыштунак нягеглы, зблытаны, але прыдатны. Што ловяць?

У падмурку палітыкі заўсёды ляжыць пытаньне пра ўласнасьць. У Расеі недзяржаўныя формы ўласнасьці ахопліваюць сёньня ўжо блізу 50% нацыянальнае маёмасьці. У Беларусі — ледзьве 2%. Вось за астатнія 98% і ідзе барацьба, якую назвалі "інтэграцыяй"!

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА
заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец — Павал Жук
рэдактар — Сяргей Дубавец
адказны сакратар — Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
рэдактар дадатку "Інфарматар" — Андрэй Лапцёнак
макет — Віктар Корзун
мантаж — Лявон Раманчык
набор — Таццяна Чуйвід
стыліст — Антон Кузьміч
карэктура — Сяргей Смятрычэнка
пры ўдзеле — Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі (тэл. 56-94-36) — Зьміцер Бартосік
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 36-76-75
Падпісны індэкс 63125

З гэтаю мэтай адціраюць канкурэнта — юны беларускі бізнэс, — пазбаўляюць яго ўплыву на эканоміку і палітыку. З гэтай жа мэтаю грубым і бесцырымонным чынам расьпіхваюць вонкавых канкурэнтаў расейскага капіталу. Гэта — аснова беларускае зьнешняе палітыкі.

Як толькі ў беларускай палітыцы зьявіліся абрысы Балтыйска-Чарнаморскага Зьвязу, залуналі пэрспэктывы стварэньня нафтакалектару з Украіны ў Латвію, адразу былі знойдзеныя... турэцкія шпіёны. Гучная была справа. Праўда, ніхто так і не назваў гэтых шпіёнаў! Але дыпляматычны скандал меў вынік. Ударыўшы хлусьнёю па турэцкіх руках, адправілі ў накаўт самую пэрспэктыўную для беларускае незалежнасьці й эканамічнага росквіту ідэю восі "Поўнач—Поўдзень". Беларусь магла выявіцца тут максымальна, як стрыжнявы суб'ект эканамічнае магістралі: Нямеччына, Скандынавія, Балтыя — Украіна, Чарнамор'е, Міжмор'е. Замест гэтага атрымалі вось з Эўропы... у нікуды. Бо гэтая вось мае свае альтэрнатыўныя паралелі: расейскія порты на Балтыцы, праект "Via Baltia", транзыт праз Украіну, расейскія порты на Чорным моры, транзыт праз тую ж Турэччыну...

Сёньня рыбакі пачынаюць абгрунтоўваць паранаідальныя праекты з Калінінградам. Хоць нават кіраўніцтва Беларускае чыгункі афіцыйна пацьвярджае, што самы танны транзыт для нас — праз Літву, а самы дарагі — праз Расею (нафтавы — у пяць разоў даражэйшы за літоўскі!). Але, гаворачы па-лукашэнкаўску, гэта ня той выпадак, калі лічаць грошы.

Зь бізнэсам у Беларусі ўжо амаль "разабраліся". Дыскрэдытавалі інвэстыцыйныя фонды. Выламалі рукі банкам. Ледзь не штотыдзень у прэсе пускаюць чуткі пра іх нацыяналізацыю. Да 1997 году Лукашэнка гатовы ўніфікаваць беларуска-расейскае заканадаўства, зраўняць у правах суб'ектаў гаспадараньня, дазволіць свабодную цыркуляцыю капіталаў. Але ж не сакрэт, што ў Беларусі капіталаў амаль няма. Лукашэнка пад фанфары ледзь сьпісаў "запазычанасьць" у 1,5 млрд. даляраў, тымчасам як маскоўская мэрыя толькі на гаражы ў Маскве выдаткоўвае 3,2-3,5 мільярдаў.

20 сакавіка Лукашэнка падпісаў указ аб стварэньні свабоднай эканамічнай зоны "Брэст", а апублікавалі яго толькі ў красавіку. Чаму? Таму, што трэба было параіцца з гаспадарамі. І 22 сакавіка ў Берасьце пад'ехаў Ягор Строеў, сьпікер верхняе палаты расейскага парлямэнту, з "інспэкцыяй". Што па чым?Ташуха! У нас, як для Расеі, усё можна ўзяць і за "спасибо". А самі мы народ ціхі, неразваротлівы. Не канкурэнты.

Калі б стваральнікамі "зонаў" кіравалі нацыянальныя інтарэсы, то свабодныя эканамічныя тэрыторыі ствараліся б ня там, дзе найвышэйшы ўзровень жыцьця ў краіне, аносна трывалая эканамічная й культурная сытуацыя, а там, дзе ўсё гэта ў заняпадзе. Такой тэрыторыяй мог бы стаць Гомель — нашмат больш індустрыялізаваны рэгіён з празбыткам працоўных рэсурсаў. Да яго, на новыя працоўныя месцы, порстка падцягнуліся б і людзі з забруджаных раёнаў. А замест зьбіраньня з усёй краіны "чарнобыльскага" падатку, трэба было б пазбавіць ад падаткаў забруджаныя тэрыторыі...

Аднак Строеў "даў дабро" на Берасьце. Каб паміж Расеяй і Захадам не было ніякіх пасярэднікаў. Цяпер уніфікацыя правоў грамдзянаў РФ зь беларусамі прыцягне да нас шматкроць большую плынь уцекачоў і "дзелавых" людзей з Паволжа і Каўказу. У выніку рэзка павялічыцца дыстанцыя паміж "непэрспэктыўнымі" раёнамі Беларусі і нэаіндустрыялізаваным паўднёвым захадам краіны, будзе загублена Белавежжа, спляжаныя самыя чыстыя й прадуктыўныя нашыя землі, разбураная самая кансэрватыўная супольнасьць, дзе яшчэ жывыя традыцыі і самы нізкі ўзровень злачыннасьці.

Але для Крамля тут галоўнае — замацавацца "на высотцы", зь якой найлепей канфрантаваць з NATO, пужаючы Эўропу, выбіваць сабе палітычныя дывідэнды, застрахавацца ад патэнцыйнага росту нацыянальнае сьведамасьці беларусаў, пакінуўшы за сабою халяўны транзыт і манаполію на кантакты са сьветам. Бо ўжо ясна, што Беларусь без Масквы і кроку ня ступіць, нават мыта сама бярэ на расейскую карысьць.

Вось якая залатая рыбка водзіцца ў інтэграцыйнай каламуці!

Што да добрых пажаданьняў наконт пэрспэктываў беларускае эканомікі — то гэта махлярства. Расея, бачыце, хоча, каб БелАЗы й МАЗы былі канкурэнцыйнымі, каб нафта ішла праз беларускія заводы і была для Беларусі таньнейшай, чым дзе ў сьвеце. А хіба АўтаВАЗ з КамАЗам здольныя з кім-небудзь канкураваць? Ці дагэтуль у Мазыр і Наваполацак ішла нейкая іншая, нерасейская нафта? І адкуль узяцца дармовай нафце, калі ў самой Расеі яна каштуе, як на сусьветным рынку?

Ці будзе хто сур'ёзна разьвіваць вытворчасьць і навуку ў прыфрантавой зоне?..

Лаўцы нашае будучыні ўзялі на рыбалку самыя каштоўныя свае прынады: адна раса (славяне!), адна вера (тысяча гадоў!), адна дзяржава (вякамі разам!). Як трапна заўважыў у Крамлі расейскі патрыярх: гісторыя вяртаецца на колы свае! На колькі ж гадоў нас вяртаюць у гісторыю: на 200, на 133, альбо на 56?

Рыбакі мітусяцца, сьпяшаюцца закінуць вуды, пакуль ня стухла прынада. А што, калі рыбка сарвецца з крука?..

Сяргей Баркоўскі

*Міхась Чарняўскі*

# Дзясятыя ўгодкі "Чорнай нядзелі"

Год Чарнобыльскай катастрофы, 1986-ы, быў пераломны ў нашай гісторыі. Успомнім тыя часы... Русіфікацыя, здавалася, сьвяткавала канчатковую перамогу, бо вынішчаліся рэшткі беларускага школьніцтва нават у далёкай правінцыі, бо самую беларускую літаратуру пачалі ўжо выкладаць па-расейску. Але, як крыніца пад ільдом, працягваў жыць адраджэнскі і незалежны рух. Больш за тое — ён пачынаў набіраць моцы і размаху. Робяцца захады дзеля захаваньня гістарычнае спадчыны, ушаноўваюцца магілы каліноўцаў, ладзяцца сустрэчы ў багдановічавай Ракуцёўшчыне, яднаеца моладзь у менскай "Талацэ", гарадзенскай "Паходні", віцебскім "Узгор'і", у друку, асабліва ў ЛІМе, уздымаецца хваля пратэсту супраць русіфікацыі.

Камуністычны рэжым робіць апантаныя спробы здушыць праявы беларускага Адраджэньня. Найхарактэрным прыкладам такіх спробаў стала "Чорная нядзеля" 20 красавіка 1986 году. Гэтым цёплым нядзельным днём так званыя воіны-інтэрнацыяналісты, нацкаваныя гаркамам камсамолу, учынілі пагром над беларускімі школьнікамі — навучэнцамі Рэспубліканскае школы-інтэрнату музыкі і выяўленчага мастацтва імя Ахрэмчыка, якія прыйшлі на бераг Сьвіслачы ў Траецкім прадмесьці на "Гуканьне вясны".

Беларускіх дзяцей у прысутнасьці міліцыі білі за тое, што яны размаўлялі пабеларуску, што сьпявалі беларускія песьні, насілі стужкі зь беларускім арнамэнтам, білі за беларускую птушку-вясьнянку. Ачмурэлым ад алькаголю пагромшчыкам камуністычныя ідэолягі ўклалі ў сьвядомасьць, што ўсё беларускае — фашызм.

Пасьля "Чорнай нядзелі" разгарнулася змасаваная кампанія паклёпу, дэзінфармацыі, запалохваньняў. Сыпаліся папярэджаньні, вымовы. Але час ужо быў іншы — пачыналася "Вясна народаў" маскоўска-камуністычнай імпэрыі...

Да 20-га красавіка засталося мала дзён. Але яшчэ ёсьць час паставіць у Траецкім прадмесьці памятны знак, сабрацца там разам менавіта 20-га, зноў зладзіць "Гуканьне Вясны" і зрабіць гэта традыцыяй.

У маім дзёньніку за 1986 год захаваліся дакумэнтальныя сьведчаньні падзеяў "Чорнай нядзелі". З асобнымі зь іх, мяркую, варта пазнаёміць чытача.

## *Зь ліста першаму сакратару ЦК КПБ М.Сьлюнькову:*

*"Пішуць Вам вучні 10 "Б" і 11 "Б" клясаў Рэспубліканскае школы-інтэрнату музыкі і выяўленчага мастацтва імя І.В.Ахрэмчыка.*

*У гэтую нядзелю, 20 красавіка, мы пайшлі на сьвята "Выстаўка аднаго дня", якое адбывалася ў Траецкім прадмесьці і было і ў мінулыя гады, у дзень гэтага сьвята "гукаюць вясну", пяюць песьні, водзяць карагоды. Мы таксама вырашылі ўзяць удзел у ім — зрабілі загадзя птушкувясьнянку, развучылі беларускія народныя песьні. Падышлі да Прадмесьця аб 11 гадзіне і пачалі сьпяваць.*

*... па дарозе двум хлопцам — Лавецкаму Уладзіміру і Стальмашку Сяргею — нейкія хлопцы сказалі зьняць стужкі з галавы (мы надзелі стужкі зь беларускім арнамэнтам). Яны, вядома, не зьвярнулі ўвагі і пайшлі далей. Не пасьпелі мы скончыць вадзіць першы карагод, як з узгорку пачалі спускацца незнаёмыя хлопцы, падыходзяць да нас і крычаць, каб мы зьнялі стужкі. У тых, хто не зразумеў і спачатку ня зьняў, зрывалі самі. У той жа час яны нецэнзурна лаяліся і казалі, каб мы, калі хочам застацца жывымі, разыходзіліся хутчэй па хатах... Нас закрылі сьпіной ад астатніх людзей і пачалі з намі "разьбірацца" кулакамі, асабліва з тымі, хто пытаў тлумачэньня гэтым падзеям, нягледзячы на тое, што большай часткай школьнікаў былі дзяўчынкі. Акрамя таго на нас крычалі: "На каком языке вы говорите? Говорите на нашем, русском языке, а иначе — убьём!" І дапаўнялі свае словы абразьлівымі выразамі: "Фашисты! Националисты!" Адной дзяўчынцы сказалі, што, калі ня пойдзе адтуль, то паплыве па рацэ, "як той ручнік". Астатнім таксама пагражалі, што калі мы не разыйдземся, то будзем карміць ракаў у рацэ. Некаторых нашых хлопцаў і дзяўчынак пачалі біць. Праўда, сьляды ад зьбіваньня засталіся не ва ўсіх, а толькі ў Карабліна Валерыя, зь дзясятае клясы Бандаровіча Ігара і Чарняўскага Алега, Якубовіч Таццяны і Мінко Віктара.*

*Было вельмі добра бачна, што гэтыя хлопцы былі ў нецьвярозым стане і што пад пальчаткамі некаторыя мелі кастэты...*

*Мы зьвярнуліся да міліцыянтаў, што стаялі на мосьце і ўсё бачылі з самага пачатку — і як мы мірна вядзем карагод, і як да нас пачалі падыходзіць незнаёмыя хлопцы, што пачалі нас біць, бачылі, што мы нічым не маглі абараніцца, але міліцыянты спакойна нам адказалі: "Это ваши гражданские дела. Разбирайтесь сами". Што мы маглі адказаць, калі нам гэта казала савецкая міліцыя? З гэтых словаў мы зразумелі, што гэтая "бойня" адбываецца "законна" і засталіся безабаронныя...*

*Мы, шукаючы абароны, пачалі расказваць акружаючым. Побач аказаліся і некаторыя з тых хлопцаў, што нас білі. Крыху зразумеўшы, што мы ні ў чым не вінаватыя, некалькі іх папрасілі ў нас прабачэньня і тлумачылі, чаму так зрабілі:*

*"Нас папярэдне сабралі ў гаркоме (некаторыя казалі, што нікога знайсьці ўжо нельга, а нават калі і знойдуць каго, то самае вялікае, што ім будзе — запішуць хуліганства (штраф 30 рублёў)). А яны потым могуць адпомсьціць...*

*У сераду нас выклікалі да дырэктара школы і там нам казалі, што нічога ня трэба рабіць, бо ўсё гэта можа зьвярнуцца супраць нас. Нам казалі, што ў нас могуць сапсавацца характарыстыкі і што нас могуць не прыняць у інстытут..."*

*Ліст ад імя вучняў падпісалі Сівіцкая Галіна і Скіцёў Андрэй.*

Не ўтрымаюся, каб не падаць адказ на падзеі ў Траецкім прадмесьці, дасланы Аляксею Марачкіну з Кіраўніцтва ўнутраных справаў Менску:

*"Ваше заявление о неправильном поведении группы молодёжи из числа демобилизованных военнослужащих в Троицком предместье во время проведения художественной выставки рассмотрено.*

*Причиной конфликта между бывшими военнослужащими и учениками Республиканской школы-интерната явилось то, что последние при исполнении песен размахивали неэстетичной атрибутикой: деревянным крестом, в перекрестии перевязанным проволокой, бумажной птицей из грязного ватмана и др. Это возмутило бывших военнослужащих, которые с применением силы отняли её.*

*Одновременно ставим Вас в известность, что выступление учеников как Вами, так и руководством школы не контролировалось, в связи с чем не было принято своевременных мер к недопущению использования неэстетичной атрибутики, наличие которой вызвало возмущение у присутствующих на выставке граждан.*

*Проведено полное разбирательство со случившимся.*

*Зам. начальніка следственного отдела Мингорисполкома В.Ф.Дайнеко".*

## Пацярпелыя ў "Чорную нядзелю" школьнікі:

*(сьпіс няпоўны)*

© Архіў найноўшае гісторыі

| | | |
|---|---|---|
| Шванбэрг Таня | Шымановіч Алена | Лавецкі Уладзімір |
| Заграбаева Люда | Белавокая Натальля | Касьцюкевіч Юля |
| Стальмашок Сяргей | Якубовіч Тацяна | Сушчыц Ліна |
| Сівіцкая Галіна | Караблін Валера | Скіцёў Андрэй |
| Мацкевіч Нэля | Сухоцкая Тацяна | Мінко Віктар |

**НАТАЛЬЛЯ БАБІНА**

# САМІ-МОЖАЦЕ-ЗДАГАДАЦЦА-ХТО ЯК БАЦЬКА БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

У акне аўтобуса мільгае пад елкай шэры, надзіва тлусты пасьля такой суровай зімы, мацёры заяц, лес абрываецца, на тле вечаровага неба паўстаюць дзьве традыцыйныя вежкі беларускага касьцёлу — і гэта ўздымае настрой. Пах падарожжа — бэнзын, вэнджаная кілбаса, гума — пах вызваленьня. Падарожжа вызваляе ад руціны. Наперадзе — Польшча.

Мы ў Горадні. Пасьля вячэры ўключаем польскую тэлевізію, і на экране, натуральна, самі-можаце-здагадацца-хто. Камэра ловіць шаленаваты бляск вока, перакладчык старанна перадае патас, які дрыжыць у голасе: "Некоторые национал-патриоты обвиняют меня в том, что я сдаю незалежность, на коленях ползу в Россию. Я хочу сказаць, что если будет нужно, если это остановит обнищание народа, я действительно поползу на коленях..." — "Ах, гадота, — думаю я. — Ды паўзі хоць ракам, твая справа, але ж чаму ты прымушаеш і ўсіх паўзьці сьледам?" Польшча паказвае менскі мітынг 24 сакавіка.

У пяць раніцы нас будзіць тэлефон — зараз за намі заедзе маршрутка. Перад мытняй "обнищавший" народ — пераважна жанчыны ў прыгожых футрах — папраўляе навешаныя пад футрамі пляшкі са сьпіртам.

— Ведаеш, а палякі ж ужо прайшлі праз гэта, — кажу я мужу. — Быў жа ў іх Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Перад вачыма паўстае вялікае палатно Матэйкі, што займае амаль усю сьцяну ў Крулеўскім замку: апошні польскі кароль з абліччам самнамбула накіроўваецца падпісваць дамову з Расеяй, шляхціц — адчай і мальба на твары — сабой заступае дарогу, а на бальконе зласьліва пасьміхаюцца дзьве расейскія графіні-куртызанкі...

Такія падзеі пакідаюць сьлед. Чым большае прыніжэньне, тым большая прага вярнуць страчаную годнасьць. З дамовы вырасла паўстаньне Касьцюшкі. "Марш, марш, Дамброўскі...", Траўгут — а ці ня ўвесь сёньняшні польскі нацыянальны дух? Пэўна, у гісторыі дзейнічае нейкі аналяг фізычнага закону індукцыі: кожная спроба зьменшыць моц нацыянальнай ідэі сустракае прапарцыйны супраціў.

— Ты яшчэ правіла сьвярдзёлка на гісторыю перакінь!..

— Наконт сьвярдзёлка не скажу нічога, а вось кінь вокам на Ўкраіну. Во дзе нацыяналізм цьвіце цьветам! А чаму? Таму што ва Ўкраіны быў Багдан Хмяльніцкі зь ягоным "На вякі разам!" І Польшча, і Ўкраіна мелі ў сваёй гісторыі "дабраахвотнае" ўзьяднаньне з Расеяй — і цяпер гэта дзьве найбольш нацыяналістычныя ў нашым кутку Эўропы дзяржавы. Беларусь будзе трэцяй. І як Станіслаў Аўгуст і Багдан Хмяльніцкі прычыніліся да росквіту польскага ды ўкраінскага нацыяналізму, так бацькам нацыяналізму беларускага стане Лукашэнка. Адсутнасьць нацыянальных каранёў у Лукашэнкі дасьць нацыянальнай ідэі больш прыхільнікаў, чым палкая сьвядомасьць Пазьняка.

Сонца скача паміж пікамі лесу. Польшча па-ранейшаму наперадзе. Наперадзе — набыцьцё шпалераў, якія сапраўды будуць удвая таньнейшыя, чым у Менску, бегатня па Беластоку, срэбны ланцужок надзвычайнае прыгажосьці ў краме, дзе шыпячыя канчаткі польскіх словаў мяшаюцца з водарам сьнегу ды аранжарэйнага бэзу.

Наперадзе — вяртаньне.

— Можа ты і маеш рацыю, — згаджаецца муж. — Але тая рацыя не на танку.

НАША НІВА 8 КРАСАВІКА 1996 №5(43)

*Славамір Адамовіч*

# ЗВЫЧАЙНЫ

*Я буду казаць пра зьяву, разьвіцьцё якой назіраю ў маёй краіне ўжо ня першы год. Адказваючы за кожнае сваё слова, я буду гаварыць пра фашызацыю структураў цяперашняга рэжыму і той часткі грамадзтва, якая ёсьць носьбітам тэорыі і практыкі антыбеларускага дзеяньня. Я буду гаварыць пра расейскі фашызм у мэтраполіі і тут, у Беларусі, як пра сілу, якая імкнецца зьнішчыць беларускую дзяржаву і яе народ. Але спачатку — экскурс у гісторыю.*

## “Няхай жыве вайна!”

Падваліны італьянскага фашысцкага руху заклалі інтэлектуалы. Рэдактар сацыялістычнай газэты “Avanti” прафэсар Бэніта Мусаліні зьявіўся потым. Яму спадабаліся напор і сьмеласьць лідара італьянскіх футурыстаў Тамаза Марынэці, які пісаў у сваім “Першым маніфэсьце футурызму”: “Няхай жыве вайна — толькі яна можа ачысьціць сьвет. Няхай жыве зброя, любоў да Бацькаўшчыны, разбуральная сіла анархізму, велічныя ідэалы зьнішчэньня ўсяго і скрозь!”

Асабістае сяброўства Мусаліні і Марынэці пачалося ў красавіку 1915 году, калі іх разам арыштавалі на дэманстрацыі ў Рыме. У сакавіку 1919 году знакаміты футурыст быў абраны ў ЦК фашысцкае партыі. А ў 1920 годзе, выступаючы перад італьянскаю дэлегацыяй на Другім кангрэсе Інтэрнацыяналу ў Маскве, нарком Луначарскі назваў Марынэці “адзіным інтэлектуалам рэвалюцыі ў Італіі”.

Крыніцамі фашызму, паводле вядомага нямецкага гісторыка Эрнэста Нольтэ, былі: нацыяналісты пад кіраўніцтвам Энрыка Карадыні, легіянэры паэта Габрыэля д’Анунцыё ды былыя марксісты, якія адкалоліся ад сацыялістычнае партыі і пайшлі за Мусаліні.

У лістападзе 1921 году італьянскі фашызм канстытуяваўся ў нацыянал-фашысцкую партыю (НФП). Першай праграмаю руху стала праграма італьянскіх баявых аддзелаў (fasci italiani di combattimento), надрукаваная ў газэце “Il popolo d’Italia” 27 сьнежня 1921 году. Крыху раней, 24 лютага 1920 году, у Мюнхене была апублікавана праграма NSDAP (Нацыянал-Сацыялістычная Нямецкая Рабочая Партыя).

Італьянскі фашызм і нямецкі нацыял-сацыялізм — блізьняты. Гітлера захапляў дучэ, Мусаліні захапляўся “гусіным крокам” нямецкіх салдатаў. Да самага свайго канца два дыктатары ішлі разам. Таму, гаворачы пра гісторыю і сучаснасьць расейскага фашызму, будзем мець на ўвазе, што апошні пераняў і разьвівае рысы як італьянскіх “фашыё”, гэтак і гітлераўскіх “штоструп” (ударных групаў), якія з часам былі пераўтвораны ў каманды СС.

## Узьнікненьне расейскіх правых

Крызыс царызму спарадзіў ня толькі рэвалюцыю 1905 году і першую беларускую газэту “Наша Ніва”. У тым самым часе на арэну гісторыі выйшла расейская “чорная сотня” — рух, які займае становішча недзе паміж рэакцыйнымі рухамі XIX і правымі (фашысцкімі) партыямі XX ст. Дэпутат царскае Думы, вядомы як Маркаў II, адзін зь лідараў “сотні” і шчыры сябра гітлераўскіх нацыстаў, пісаў, што духоўна расейскі дарэвалюцыйны рух быў амаль тоесны нацыянал-сацыялізму.




Тэрмін “чорная сотня” ахоплівае розныя крайнія правыя групы, якія йснавалі ў пэрыяд да бальшавіцкага перавароту, у тым ліку і такія партыі, як Саюз Расейскіх Людзей (сакавік 1905) і Саюз Расейскага Народу (лістапад 1905). Дарэчы, СРН пад кіраўніцтвам доктара Дубровіна дабраславіў сам цар Мікалай II. Француска пасол у Расеі Жорж Люі пісаў: “Чорная сотня” кіруе краінай, і ўрад слухаецца яе, бо ведае, што імпэратар схільны сымпатызаваць ёй”.

Сацыяльную базу і мэты СРН яскрава выяўляе выказваньне графа Вітэ: “Саюз — арганізацыя звычайных злодзеяў і забойцаў. Мэты “чорнае сотні” эгаістычныя і маюць самую нізкую прыроду. Іх імкненьні дыктуюцца страўнікам і кішэняй. Гэта тыповыя забойцы зь вялікай дарогі”.

Самадзяржаўе выкарыстоўвала “чорную сотню” як супрацьвагу ў барацьбе зь левым рухам і выступленьнямі рабочых. А Сталыпін, пра якога і ў нас, і ў Расеі некалькі апошніх гадоў згадвалі з асаблівым прыдыханьнем, быў героем правых. Урэшце патураньне ўладаў прывяло да таго, што ў кастрычніку 1905 году па ўскраінах імпэрыі пракацілася хваля асабліва дзікіх жыдоўскіх пагромаў. У Воршы, напрыклад, у арганізацыі тэрору брала ўдзел мясцовая паліцыя.

Пасьля спаду рэвалюцыйнага руху паміж чарнасоценцамі абвастрыліся супярэчнасьці. Вядомы ўсёй Расеі думскі дэпутат Пурышкевіч заснаваў свой “Саюз Міхаіла Архангела”. Ён лічыў, што Расею могуць ураваць толькі надзвычайныя меры. Адным з апошніх яго радыкальных актаў было забойства царскага фаварыта Распуціна.

Канцэпцыя СРН засноўвалася на традыцыйнай царскай дактрыне “праваслаўе, самадзяржаўе, народнасьць”. “Чорная сотня” выступала супраць парлямэнтарызму і за скліканьне Сабору, апэлюючы да традыцыі такіх сходаў у расейскай гісторыі.

СРН карыстаўся папулісцкімі лёзунгамі і тактыкай, і тымчасам заставаўся неаддзельнаю часткай сыстэмы, якая падтрымвала яго фінансава і палітычна. Рух не вылучыў лідара кшталту Гітлера, і працягваў лічыць найвышэйшым аўтарытэтам цара. У адрозьненьне ад нацыстаў і італьянскіх фашыстаў, СРН ніколі ня быў цалкам незалежны, не парываў з істэблішмэнтам і не імкнуўся трансфармавацца ў партыю новага кшталту. Расізм СРН выводзіў яго за межы рэлігіяў, але гэта не перашкаджала афіцыйнай царкве падтрымваць з чарнасоценцамі самыя шчыльныя кантакты.

Пасьля прыходу да ўлады бальшавікоў “чорная сотня” была разагнаная. Ідэя расейскіх правых паляцела ў эміграцыю.

## Расейскія фашысты ў дыяспары

У 20-я гады ўзьніклі арганізацыі моладзі, сябры якіх ясна ўсьведамлялі, што эміграцыя старэйшага пакаленьня не дасягнула ў барацьбе з бальшавізмам аніякіх посьпехаў. Гэтыя групкі былі асабліва квапныя на фашысцкія ідэйкі.

Младаросы Аляксандра Казэм-Бэка, абруселага нашчадка арыстакратычнага турэцкага роду, прапагандавалі таталітарную манархію, барацьбу супраць масонства і міжнароднага капіталу. Казэм-Бэк пераняў усе атрыбуты фашызму — уніформу, ваенную дысцыпліну, пакланеньне фюрэру. На сходах яго віталі падняцьцем правай рукі і воклічам “Глава!” Пакланеньне Мусаліні і Гітлеру спалучалася ў младаросаў з захапленьнем палітыкай Сталіна, пры якім савецкі камунізм зрушыўся ад інтэрнацыяналізму да нацыянал-сацыялізму. Младаросы вызнавалі ксэнафобію і расізм (“каждый инородец — наш враг”), верылі ў перавагу белае расы ды імпэрскую місію Расеі.

Расейскія фашысцкія партыі ў 30-я гады дзейнічалі на тэрыторыі Нямеччыны і Манчжурыі. У Харбіне была заснаваная РФП на чале з Канстанцінам Радзаеўскім. Манчжурскія фашысты цалкам капіявалі гітлераўскіх нацыстаў (уніформа, свастыка, часопісы “Нация” і “Наш путь” зь перадрукамі карыкатураў са “Штурмэра”); супрацоўнічалі з Квантунскай арміяй.

Трапіўшы ў рукі саветаў, Радзаеўскі з сумам прызнаў, што ягоная барацьба была заснаваная на прыкрай недарэчнасьці: “Сталінізм — гэта якраз тое, што мы памылкова называлі “расейскім фашызмам”. Гэта і ёсьць наш расейскі фашызм, толькі ачышчаны ад скрайнасьцяў, ілюзіяў ды памылак”.

Капіявала стэрэатыпы Бэрліну ды Рыму і “Всероссийская фашистская организация” (ВФО) Анастасія Вансяцкага, заснаваная ў 1933 годзе ў штаце Канэктыкут. Ніякага рэальнага ўплыву на палітыку Злучаных Штатаў ВФО ня мела.

Найбольш уплывовы быў “Народно-Трудовой Союз” (НТС), створаны эміграцкай моладзьдзю ў Югаславіі ў 20-х гадах. НТС існуе да сёньняшняга дня.

У 30-я гады НТС засьведчыў сяброўскія адносіны да нацыянал-сацыялізму, у якім ён бачыў ідэю слуганьня нацыянальным інтарэсам. НТС не займаўся перайманьнем, імітацыяй нацызму, устрымваўся ад капіяваньня найбольш жорсткіх ягоных рысаў. У часе вайны энтээсаўцы супрацоўнічалі з РОА генэрала Ўласава. У наш час НТС мае мінімальны ўплыў на ідэалёгію новых расейскіх правых.

## Правыя ў сучаснай Расеі

Фашызм, пэрсаніфікаваны ў асобах Мусаліні і Гітлера, перастаў існаваць. Але, як сьведчыць разьвіцьцё падзеяў, у пэўных умовах брунатная чума можа вярнуцца. У посткамуністычнай Расеі рост фашысцкіх настрояў падмацоўваецца няжжытымі камуністычнымі ілюзіямі і жаданьнем аднавіць імпэрыю. Расейскаму фашызму ўласьцівыя ксэнафобія, антысэмітызм ды экстрэмізм у самых розных праявах. Ён запаўзае і ў прафсаюзныя структуры, і ў студэнцкія аўдыторыі, і ў расейскі “белы дом”. Фашысцкія партыі Расеі спрабуюць укараніцца ў войску, органах правапарадку і дзяржбясьпекі. У Санкт-Пецярбурзе, напрыклад, на выбарах у гарадзкі сход значную частку кандыдатаў ад нацыянал-патрыятычнага блёку “Вялікая Расея” склалі кіраўнікі акцыянэрных таварыстваў “Навінка”, “Кітэкс”, ахоўнае фірмы “Рубікон”...

Сёньня са шматлікіх расейскіх партыяў можна вылучыць наступныя аб’яднаньні фашысцкае скіраванасьці:

**Нацыянальна-Патрыятычны Фронт “Памяць”.** Узьнік у сярэдзіне 80-х. Колькасьць — блізу 500 чалавек. Лідар — Дзьмітры Васільеў, які ў 1992 г. абвясьціў сябе “манарха-фашыстам”.

**Расейскае Нацыянальнае Адзінства (РНЕ).** Ваенізаваная арганізацыя нацыянальнай арыентацыі. Створана ў кастрычніку 1990 г. некалькімі былымі сябрамі НПФ “Памяць”. Выступае за ўсталяваньне дыктатуры з дапамогай ваенных. Кіраўнік — Аляксандар Баркашоў. Баркашоўцы супрацоўнічаюць з Саюзам афіцэраў падпалкоўніка Церахава, з Фондам абароны патрыятызму генэрала Ачалава, маюць падтрымку газэты “Завтра” (рэдактар А.Праханаў).

**Народна-Сацыялістычная Партыя Расеі (НСПР).** Выйшла зь нетраў Навасібірскае філіі РНЕ, што ініцыявала Першую ўсерасейскую канфэрэнцыю, на якую зьявілася 46 дэлегатаў ад 17 рэгіёнаў —прадстаўнікі мясцовых арганізацыяў РНЕ, а таксама дэлегаты ад омскай арганізацыі “Белая Гвардия”, томскага Расейскага Нацыянальнага Сабору, ад Сібірскага казацкага войска. Партыйны орган — газэта “Эра России”, на старонках якой дэманструецца глыбокая сымпатыя да фашызму.

**Нацыянальна-Рэспубліканская Партыя Расеі (НРПР).** Нацыянал-радыкальная арганізацыя з цэнтрам у Санкт-Пецярбурзе. Створана ў красавіку 90-га. З 1991 году пры НРПР утвараецца ваенізаваны Расейскі Нацыянальны Легіён.

**Расейскі Нацыянальны Саюз (РНС).** Узьнік з групы моладзі, што адкалолася ад “Памяці” Васільева. Будучыню Расеі бачыць ва ўсталяваньні нацыянальна-дзяржаўнага манархічнага ладу.

Паводле зьвестак Маскоўскага антыфашысцкага цэнтру, у Расеі дзейнічае каля 100 арганізацыяў фа-

# ФАШЫЗМ-2

шысцкага кшталту з колькасьцю членаў 5000. Найбольш актыўныя групы — у Маскве (600 чалавек), Санкт-Пецярбурзе, Волагдзе, Навасібірску, Чарапаўцы, Краснадары, Стаўрапалі.

Найбольшую небясьпеку ўяўляе РНЕ. Адзін з намесьнікаў Баркашова М.Фёдараў балятаваўся ў Дзярждуму ў 109-й Мыцішчынскай акрузе, дзе набраў 5% галасоў.

Фашысцкія арганізацыі выдаюць на сёньня 157




назваў пэрыядычнай літаратуры.

*

1996 год. Яраслаўскі абласны суд вынес прыгавор абвінавачаным у справе фашысцкага легіёну "Вэрвольф". Кіраўнік групоўкі Ігар Піражок атрымаў 5 гадоў пазбаўленьня волі ў калёніі агульнага рэжыму. 9 гадоў атрымаў В.Баранаў, прызнаны ў забойстве свайго паплечніка Старчыкава, — з трупа былі зрэзаны вушы, якія Піражок выкарыстоўваў для падтрыманьня дысцыпліны ў арганізацыі.

## Расейскі фашызм у Беларусі

*Россия должна быть унитарным государством Русских и Россиян. Под Русскими понимаются представители Русской Нации, состоящей из триединого Русского Народа — Великороссов, Малороссов (украинцев), Белороссов.*

З праграмы РНЕ

*Соратник обязан постоянно помнить, что у России друзей нет. Забывший об этом становится предателем.*

З кодэксу гонару РНЕ

Дзейнасьць расейскіх правых (расейскае "пятай калёны") на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі ажыцьцяўляецца дваякім чынам: праз структуры "вэртыкальнай" улады пад шыльдаю славянскай ідэі і шляхам адкрытага пашырэньня ў нашым грамадзтве фашысцкіх і нацысцкіх антыбеларускіх ідэяў і настрояў, заклікаў да тэрору супраць грамадзянаў, якія не паддаюцца дэбеларусізацыі.

Цалкам антыбеларуская арганізацыя, якая дзейнічае на нашай тэрыторыі, — філія РНЕ пад кіраўніцтвам Андрэя Валіуліна. Пра гэтую маргінальную групу тутэйшыя газэты пачалі пісаць у 1994-м, пасьля прыходу да ўлады Лукашэнкі. У "раскрутцы" баркашоўцаў на старонках пэрыядычнага друку асабліва вызначылася колішняя карэспандэнтка газэты "Беларуская маладзёжная" Ц.Клыкоўская. 1 верасьня 1994 году яе матэрыял пад назваю "Опричники" выйшаў у першым нумары газэты "Мужской клуб". Гэта разгорнутае інтэрвію з галоўным баркашоўцам у Беларусі. Ажно два здымкі мальца пры партупэі...

Малец Андруша — з наежджых. Штосьці не затрымаўся ён у расейскай мэтраполіі, — пацягнула ў Беларусь. Працаваў на Менскім аўтамабільным, вучыўся ў веннай вучэльні... Тып нэрвічны, з парушанай каардынацыяй руху. Інтэнсіўная патлівасьць лучыць яго з другім нэрвічным тыпам —Жырыноўскім. Працуе Андруша вартаўніком на будоўлі ў сталічным мікрараёне "Уручча".

Валіулін — фанатычны антысэміт, змагаецца за ўмацаваньне нацыянальнае самасьвядомасьці славяна-расейскага народу. Ён шчыра прызнаецца: "У нас нет конфликтов с милицией, ведь там работают такие же русские люди. Я разговаривал с некоторыми работниками милиции и ОМОНа, в целом им импонирует наша идеология".

Самадзейніца-журналістка Клыкоўская захапляецца: "Да, это единственная организация, поражающая безукоризненной выдержанной доброжелательностью и открытостью... Да, это по-настоящему мобильное, почти боевое подразделение. Но это не "пятая колонна".

І далей: "У час перадвыбарчай кампаніі баркашоўцы працавалі ў ахове штабу цяперашняга прэзыдэнта РБ".

Як вынікае са шчыраваньняў Валіуліна, РНЕ мае шчыльны кантакт з "Славянскім саборам".

Акрамя матэрыялу ў "Мужском клубе" інтэрвію з баркашоўцам А.В. за подпісам Ц.Клыкоўскай было надрукавана ў "Газете Андрея Климова". Аж два разы расейскаму нацыянал-фашысту даваў слова на старонках "7 дней" рэдактар тыднёвіка І.Гукоўскі.

Філія РНЕ ў Беларусі фінансуецца маскоўскім цэнтрам. Кожны месяц "баркашаты" атрымліваюць грашовую дапамогу ў межах 500 даляраў. Дапамагаюць ім і некаторыя фірмы, якія знаходзяцца ў Беларусі.

Як паведамляе інфармаваная крыніца, блізкая да ваенных колаў, апошнім часам стала яўна адчувацца, што тутэйшае РНЕ "вядзе" моцная рука з нашага Міністэрства абароны. Ёсьць зьвесткі, што заняткі саратнікаў адбываюцца на палігонах на Уруччы ды Мар'інай Горцы.

У маскоўскім штабе РНЕ заведзены асабістыя справы на лідараў беларускага руху і тых палітыкаў, якія сёньня знаходзяцца ў апазыцыі да існага ў Беларусі рэжыму. Дасье стала папаўняецца, бо рэгіянальны кіраўнік А.Валіулін ведае, што за невыкананьне загаду аб зборы інфармацыі ён будзе жорстка пакараны.

*Працяг на старонцы 20*

Юнна Морыц

## Каралі гуляюць у хованкі

*з цыклю "Валасатае цела фашызму"*

**Гульня з агнём. Двудушнасьці задушша.**
**Дзяцінае шальмоўства каралёў!**
**Рыхтуецца — ура! — аблога сушы,**
**Аблога сушы з чорных караблёў,**
**А выгляд робіцца, што ўсё ўрачыста,**
**Парад, салют, цудоўны перабег,**
**І што кароль — забаўнік і няўрымста,**
**Вясёлы, таварыскі чалавек!**

**Скал зіхацяць выносістыя ўступы,**
**Атручанае музыкі зварот.**
**Яшчэ гуляюць кандыдаты ў трупы,**
**Ня здраднік шчэ ніхто, не патрыёт.**
**Ды пах крыві, паветра мору злое,**
**Нібыта дым, паўзе ўжо з-за скалы...**
**Ды ясны лёс краіны, да якое**
**Ў любові сяньня кляліся паслы.**

**Яшчэ лятуць да опэры карэты.**
**На сьпіне выраз сукні шчэ відаць.**
**Але ў сакрэтаў — голыя шкілеты,**
**І па краіне косткамі грымяць!**
**І дзьве дзяўчыны зь пёрамі на ўборах**
**Ад бабнікаў выпадкам вызнаюць,**
**Што ноччу ў штабе ладзіліся зборы**
**І што ў сабе ўрачыстасьці нясуць!**

**І разабраўшыся ў двудушшы справы**
**І што крывёй ад рызыкі сьмярдзіць,**
**Яны бягуць з купленых месцаў жвава**
**І хусткай віск імкнуцца ў глоткі ўбіць!**
**А дзьве зямлі, два самадзержцы — квіты!**
**Над караблём бярэ даносчык верх.**
**І па палях, як чорныя тэрміты,**
**Паўзуць ужо калёны — зьнізу ўверх.**

**Пакуль выведнік напівае віны**
**І лічбы больш дакладна назаве,**
**Ваеначальнік гэта ўсё прыкіне,**
**Дыхтоўную расправу падбярэ!**
**Ён так складзе даручаныя косьці,**
**Так пералічыць колькасьць перамог,**
**Што ТОЙ кароль задушыцца ад злосьці —**
**Няздара! Ёлуп! Дармаед! Ня змог!**

**Дадумацца: пяхоту — і на ўступы!**
**Дадумацца: наперад выслаць флёт!**
**Яшчэ гуляюць кандыдаты ў трупы.**
**Ня здраднік шчэ ніхто, не патрыёт.**
**І ў ашуканстве шчэ кароль ня блудзіць.**
**І ложак мерцьвяка астыў наўрад.**
**А сьмерць растворам мажа ўсіх, хто будзе**
**Занесены ў калёнку людзкіх страт!**

Пераклаў з расейскай
Зьміцер Дзядзенка

ГАННА МАТУСЭВІЧ

# Койданаўскі дыярыюш

20.03. Ён быў нашым суседам. Ён быў дзядзькам, а я – дзіцём. Петкавіч Франак. Ён скончыў журфак і працаваў настаўнікам у Станькаве. Дзеці яго любілі. Пасьля сьпіўся і рабіў на розных работах у нашым калгасе. Яго п'янога дызэль завозіў то ў Баранавічы, то ў Берасьце. Ён пісаў у раёнку нейкія вершы пра вайну: "...і Негарэлае гарэла". Ягоная змучаная маці ўжо прасіла, каб яго прыбраў Бог. І ў адзін вечар ён згарэў ад гарэлкі.

А сёньня мне бацька прызнаўся, што Франак сьпяваў яму словы да Палянэза Агінскага. Якія гэтыя словы, я, пэўна, ніколі не даведаюся...

23.03. Янка Брыль не разумее, за што ў вучэньні Рэрыха ўхваляецца Сувораў.

"А я кажу вам: любіце ворагаў вашых, дабраслаўляйце кляцьбітаў вашых, рабіце дабро ненавісьнікам вашым і маліцеся за крыўдзіцеляў вашых і за ганіцеляў вашых".

У Койданава не прыйшоў другі нумар "НН". І канцоў не знайду. Пэўна згубіўся недзе ў сьвяточных клопатах зьняважанай Канстытуцыі.

24.03. Была на мітынгу. І не была. Пляц віраваў. А ў маёй душы – пустата, нават абыякавасьць. Можа таму, што я ўсё перажыла раней, альбо таму, што Неба дае мне гэты тужлівы спакой, як перадых перад нечым новым, нязьведаным...

25.03. Сяджу зь дзецьмі ў вёсцы, як у турме. І тое няможна, і туды няможна. Цяпер ужо й наш інтэрнат здаецца мне вольніцай. Нашая вёска – вытак духовага ўбоства і вышэйшай духовай узьнёсласьці.

26.03. Вераніка ўстроілася ў чырвоную куртку й зялёныя боты ды сама зь сябе пакеплівае: "Прыбралася, як лукашэнкаўскі сьцяг".

Уздоўж чыгуначнага палатна, на сьнезе, выпальваюць дрэвы. "Мама, глянь! Наш сьцяг!" – крычыць Міколка.

27.03. У нашым інтэрнаце, нібы пры Бабілёнскай вежы, сышліся розныя традыцыі, культуры, нацыі... Маладая габрайка выправіла малую дачку да суседкі з цыдулкай наступнага зьместу: "Люба, дай мне один презерватив. Я знаю, что у тебя есть". У паважнай украінкі запунсавалі шчокі: "Що це таке?!"

29.03. Прывезла дзяцей зь вёскі. Як з ланцуга сарваліся! Уключылі магнітафон, усчалі шалёныя скокі:

*А воля на ратным полі*
*Мільгнула між лесу дзід!*

31.03. Яшчэ зь дзяцінства не люблю нядзеляў. Насунецца пякучы прыступ тугі...

1.04. Дзень, і вечар, і ноч... Дык вось што мяне так душыла! І сёньня яшчэ аж два пальцы на дзьвюх руках парэзала!

Прыйшоў муж з працы, прынес мокрую муку. Кажа: не мука гэта, ды мука. Сёньня цэлы дзень круціць шалёны вецер з мокрым сьнегам. І ўначы круціла, і наступная ноч нічога добрага не абяцае. Як хто павесіўся... Праўда, павесіўся. Віця Амбражэвіч, майстар ГСП-42 (некалі СУ-42). У сталярцы, на працы. Нашы мужчыны зь пятлі яго здымалі. Займчалі ў рэанімацыю бедака. Хацеў чалавек звальняцца, ды Камушэнка яго не пускаў, як матэрыяльна-адказную асобу. Ня вытрымаў мужык! Эх вы, дужая палова чалавецтва!

Прыйшоў да нас п'яненькі Ваня Грыбок. Я яго нейк адразу "Бусьлікам" перайменавала. Высокі, худы, даўганосы, добры і ня дужа мудры. Паставіў "Двух буслоў" на стол: "Я хадзіў, я казаў яму... Яны маўчаць... Усе баяцца... Я дурань..." І бясконцыя мацюкі. Што ж рабіць? Ага, сабраць людзей! Хто пойдзе? Я адна пайду. Заўтра ў 9.00 – у кантору! Да кожнага падыйду, кожнаму скажу, і кожны хай сам вырашае...

– Ну, сядзіце. Я пабегла...

P.S. Хадзілі тэлефанаваць. У цяжкім стане. Божачка, памажы яму! Божа, дай нам усім Прасьвятленьня, ратуй Беларусь!

*Койданава*

## УКРАІНА

# Народныя дэпутаты пра беларускі варыянт

*Нягледзячы на тое, што практычна ўсе ўкраінскія палітыкі на пытаньне пра ацэнку расейска-беларускага пагадненьня адказваюць унікліва: "Гэта іхнае права", – заклапочанасьць і трывога ў водгуках, тым ня менш, ёсьць. Пры гэтым усе згодныя ў адным: з аб'яднаньнем Масквы і Менску сытуацыя для Кіева значна ўскладніцца, але непасрэднай пагрозы ўкраінскай незалежнасьці пакуль няма.*

### Барыс Алейнік, Камуністычная фракцыя парлямэнту:

– Аб'ядноўвацца ці не – справа сувэрэнных дзяржаваў. Нам пра сваё трэба думаць. Не лічу, што аб'яднаньне Расеі і Беларусі можа паўплываць на Ўкраіну. Мы выбралі свой шлях. І спробаў ціску на нас з боку Масквы, каб прымусіць пайсьці за прыкладам Беларусі, упэўнены, ня будзе. Расейцы ня ведаюць, што ім рабіць зь Беларусяй – навошта ім яшчэ і Ўкраіна? Папросту Ельцын прагуляў выбары ў Думу і цяпер наганяе. А з Украінай беларускага варыянту не атрымаецца. Ня тыя маштабы. Мы нават не ўваходзім у СНГ. Украіна – толькі асацыяваны сябра. Наш пункт гледжаньня даўно ўсім вядомы – сувэрэнная дзяржава.

Зблізжэньне дзяржаваў не павінна адбівацца на нашым сувэрэнітэце. Беларускі варыянт нявыгадны ня толькі нам, але і Расеі. Сябраваць могуць адно свабодныя. Бо калі адзін сябра старэйшы – гэта ўжо ад нячысьціка.

### Леанід Краўчук, экс-прэзыдэнт:

– Не хачу ўмешвацца ва ўнутраныя справы Расеі і Беларусі. Народы, дзяржавы павінныя самі вырашаць. Я заўсёды толькі вітаў супрацоўніцтва. Думаю, акрамя эканамічнае мэтазгоднасьці, ніякіх абмежаваньняў быць ня можа, калі рэч зводзіцца да эканамічнай інтэграцыі. Але ў выпадку з Расеяй і Беларусяй, як я зразумеў, гутарка ідзе пра інтэграцыю палітычную. Прасьцей кажучы, пра стварэньне новай дзяржавы. Яны ўжо прынялі рашэньне стварыць наддзяржаўную структуру: Найвышэйшую выканаўчую раду, пастановы якой для абодвух бакоў абавязковыя. Будзе створана і нейкая міжпарлямэнцкая структура, якая зоймецца "прыстасаваньнем" заканадаўстваў абедзьвюх краінаў. І самае галоўнае: прадугледжваецца агульны бюджэт пад мэтавыя (пакуль што!) праграмы. Усё гэта сьведчыць пра тое, што ўтвараецца нават не канфэдэрацыя. Лічу, што Расея і Беларусь ствараюць фэдэрацыю. А размовы пра канфэдэрацыю – самападман. Усё сьведчыць пра тое, што нараджаецца адзіная дзяржава.

Дарэчы, першыя прыкметы таго, што яна амаль створана – відавочныя. Прыклад? Успомнім першы афіцыйны візыт Лукашэнкі ў Маскву: прымалі яго ў гранавітай палаце, была такая пампэзная сустрэча, абед. А ў гэты ягоны прыезд як усё адбывалася? Ад Менску выступае Лукашэнка, ад Масквы – толькі прэс-сакратар Ельцына... Цікавая сытуацыя. Крэмаль прымаў першага сакратара ЦК Кампартыі саюзнай рэспублікі – проста як кіраўніка рэспубліканскай арганізацыі – ня больш. Разумееце, толькі адзін гэты эпізод расстаўляе ўсіх на свае месцы. Пасьля гэтага казаць пра дзяржаўнасьць Беларусі – прынамсі фарс. Але – я паўтараю – гэта справа Лукашэнкі, Ельцына і тых людзей, якія іх абралі.

Зрэшты, вядома ж, на Ўкраіну падобныя рашэньні таксама могуць паўплываць. Як? У рамках СНГ цяпер будуць тры ўзроўні інтэграцыі. Зразумела, адносіны на гэтых узроўнях будуць розныя. Уласна СНГ адыдзе на апошні плян. Зразумела, Расея да Ўкраіны цяпер будзе ўжываць больш жорсткія формулы. І гэта, натуральна, паўплывае на нашы эканамічныя магчымасьці. І яшчэ: перад левымі сіламі Ўкраіны цяпер увесь час будзе мігцець прыклад шчыльнага "единения". Пойдуць размовы: "Расея і Беларусь ужо аб'ядналіся, і мы, славянскі народ, таксама павінны". Гэта будзе бутаражыць людзей. Але ёсьць, думаю, і станоўчы бок: канструктыўныя, прагрэсіўныя сілы, якія хочуць бачыць Украіну незалежнай і свабоднай, цалкам магчыма, нарэшце аб'яднаюцца.

### Алег Вітовіч, лідар Украінскай нацыянальнай асамблеі:

– Аб'яднаньне Беларусі з Расеяй азначае павелічэньне мяжы з нашым магчымым супраціўнікам больш чым на 500 кілямэтраў. Гістарычна так склалася, што апошнія некалькі стагодзьдзяў найбольш верагодным нашым супраціўнікам (хоць даволі часта і саюзьнікам таксама) была Расея. Такім чынам павялічваецца фактар ваеннай пагрозы Ўкраіне з боку Масквы. Павышаецца і фактар палітычнае небясьпекі. Акрамя таго, цяпер магчымая актывізацыя ўкраінскіх левых. Пад пагрозу пастаўленая стабільнасьць у Эўрапейскім рэгіёне, ды і ва ўсім сьвеце.

Гэта вельмі сур'ёзна, бо гутарка ў дадзеным выпадку ідзе пра ўтварэньне новай дзяржавы. Нават больш – пра аднаўленьне былога Савецкага Саюзу. Натуральна, гэта ня можа ня выклікаць трывогі ва ўсім сьвеце. Мы на такі крок Расеі і Беларусі пазіраем зь вялікай заклапочанасьцю. Таму УНА будзе спрыяць сябрам з радыкальнага кола Беларускага Народнага Фронту. Мы гатовыя даць ім маральную і палітычную падтрымку. Пакуль што нічога іншага яны ў нас не прасілі. Калі будзе просьба пра іншыя віды падтрымкі – мы разгледзім і такую магчымасьць.

*"Всеукраинские Ведомости"*

## ЛІТВА

**ЯЦЬВЯГІ.** Залаты мэдаль на традыцыйнай штогадовай выставе "Літва філятэлістычная" атрымаў жыхар Клайпеды Жыгімонт Юшка за калекцыю капэртаў і паштовых марак, прысьвечаных яцьвягам і беларускаму Заходняму Палесьсю. Увогуле яцьвяская тэматыка ў Літве сёньня, можна сказаць, у модзе. У кожнай віленскай краме можна набыць каўбасу, названую ў гонар невядома куды зьніклага балцкага племені; у кнігарнях прадаюцца зборнікі яцьвяскіх казак. А днямі газэта "Lietuvos Aidas" пачала друкаваць зводкі навінаў з Заходняга Палесься. Зарэгістраваны "Літоўска-яцьвяскі зьвяз", які, праўда, пакуль ніяк сябе не праяўляе.

**MASS MEDIA.** На мяжы банкруцтва апынулася найбуйнейшае літоўскае агенцтва навінаў ELTA. Сёньня гэтае прадпрыемства ня здольнае ані заплаціць партнэрам за падпісныя пакеты інфармацыі, ані выплаціць заробак сваім супрацоўнікам. Прычына крызысу зьвязваецца з тым, што толькі 20% капіталу тэлеграфнага агенцтва знаходзіцца ў прыватных руках. Астатнія належаць дзяржаве, у якой няма сродкаў на ўтрыманьне гэтай структуры.

**МЯЖА**. На чацьвярговай прэс-канфэрэнцыі фракцыі таўтынінкаў (нацыяналістаў), лідар гэтае правае партыі Р.Смятона заявіў, што ягоная фракцыя ўнясе ў Сэйм прапанову не ратыфікоўваць літоўска-беларускае пагадненьне аб дзяржаўнай мяжы, а прапануе вярнуцца да межаў, вызначаных літоўска-савецкім пагадненьнем 1920 году, паводле якога да Літвы адыходзіць блізу 25% беларускай тэрыторыі.

*Падрыхтаваў Андранік Антанян*

**ТАНЦЫ.** 30 сакавіка ў Літоўскім акадэмічным драмтэатры адбыўся паказ "Новага літоўскага танцавальнага праекту". Дзясятак маладых харэографаў разам з сваімі выканаўчымі групамі дэманстравалі міні-спэктаклі, альтэрнатыўны балет, дзе "нékананічны" рух, плястыка цела спалучаліся з самай рознай музыкай, сцэнаграфіяй і нават вершамі. Неверагодная фэерычная дзея сабрала поўную залю моладзі. На думку карэспандэнта "НН", найбольш плястычны міні-спэктакаль –"Дзяўчынка на шары" паводле матыву П.Пікаса – паказаў беларускі мім-віленчук Валеры Самусёнак у пары з зоркаю літоўскага сучаснага балету Расаю Алькснітэ. *(брат)*



## ПОЛЬШЧА

# Абвінавачваецца сыстэма

У Гданьску распачаўся судовы працэс у справе "Сьнежня 1970-га". На лаву падсудных ваяводзкага суда селі 12 чалавек, сярод якіх і генэрал Войцех Ярузэльскі. Пракуратура абвінавачвае іх у гібелі 44-х рабочых 26 гадоў таму падчас разгону дэманстрацыі, скіраванай супраць павышэньня цэнаў. На думку Я.Рыбіцкага, кіраўніка Прэзыдыюму Ўправы "Салідарнасьці" гданьскага рэгіёну, гэта будзе адзін з найважнейшых судовых працэсаў у сучаснай гісторыі Польшчы. На лаву падсудных упершыню селі не непасрэдныя выканаўцы загадаў, а тыя, хто іх аддаваў. Абвінавачваецца сыстэма ў цэлым.

# Польскі экспарт на Ўсход

Летась экспарт польскае прадукцыі ва Ўкраіну вырас утрая, а ў Беларусь – падвоіўся. Экспэрты сьцьвярджаюць, што гэты год можа быць яшчэ лепшым. Польскія гандляры прадалі на ўсходніх рынках прадукцыі на 800 млн. даляраў, што на 33% болей за пазалеташнія паказьнікі. Пры гэтым на Расею прыпадае 514 млн., на Украі-

Працяг на старонцы 19

# Чачэнскі народ ніколі ня будзе жыць у складзе Расеі

## *Інтэрвію Джахара Дудаева амэрыканскаму часопісу Time*



***Вайна ў краіне прымушае прэзыдэнта Чачэніі Джахара Дудаева жыць "на колах", кожную ноч ён праводзіць у іншым месцы. Карэспандэнт Time сустрэўся з чачэнскім лідарам у бясьпечным месцы – за 500 м ад посту расейскага войска.***

**Time: За апошнія шэсьць месяцаў Вашы людзі два разы захоплівалі цывільныя шпіталі ў Расеі, бралі закладнікаў. Ці спадзяецеся Вы адваяваць сваю незалежнасьць, выкарыстоўваючы тактыку тэрору?**

Джахар Дудаеў: Захад ігнаруе тэрарыстычную тактыку Расейскай дзяржавы. Расейскае войска зьнішчыла ўсе нашы шпіталі й школы. Нашым людзям засталося толькі зьбіраць парэшткі сваіх дзяцей пасьля расейскіх бамбардовак. І вы яшчэ абвінавачваеце чачэнцаў у тэрарызме! Аднак абедзьве памянёныя вамі акцыі былі грубымі парушэньнямі маіх загадаў. Мы арганізуем вайну сабатажу ў Расеі, і ў ёй ня будзе тэрарызму або захопу закладнікаў.

**Time: Ці бачыце Вы магчымасьць спыніць вайну?**

Дж.Д.: Вайну можна было спыніць адным росчыркам пяра – безь якіх-кольвек агаворак з абодвух лягераў. Ельцыну трэба падпісаць загад са свайго боку, а мне – са свайго. Не патрэбная нават мая асабістая сустрэча зь Ельцыным. Ельцын зусім не жадае такой сустрэчы, і ў мяне таксама няма ніякага жаданьня глядзець на яго. Мала таго, я ведаю, што шматлікія сілы каля Ельцына проста не дазваляюць са мною сустрэцца.

Нам варта адкінуць дробныя амбіцыі і скончыць вайну. Цяпер я магу даць гарантыі, што сілы Расеі змогуць адысьці мірна. Некалькі месяцаў таму я ня мог гарантаваць ім бясьпечную дарогу дадому.

**Time: Вы сказалі, што плянуецца разьвіваць ваенныя дзеяньні ў Заходняй Эўропе. Як гэта разумець?**

Дж.Д.: Журналіст пытаецца ў мяне, ці рыхтуемся мы наступаць на Маскву, а я проста адказваю – чаму б не наступаць на Заходнюю Эўропу?

**Time: Ці тлумачыцца агрэсія Расеі тым, што Ваш народ вызнае іслам?**

Дж.Д.: Так. Яны прымусілі нас абраць гэты шлях, хоць мы яшчэ не былі гатовыя належным чынам прыняць ісламскія каштоўнасьці. Сёньня мы можам схінуцца да вычварнай формы ісламу, якая можа быць небясьпечная для Захаду.

**Time: Што маглі б зрабіць ЗША, каб дапамагчы ўрэгуляваць канфлікт у Чачэніі?**

Дж.Д.: ЗША варта было б адыграць сваю ролю – гаранта патэнцыйных пагадненьняў, партнэра, зацікаўленага ў распрацоўцы і транспартаваньні нафты і ў агульнай стабільнасьці.

**Time: Як Вы ўяўляеце ў будучыні адносіны паміж Расеяй і Чачэніяй?**

Дж.Д.: Мае няшчасьце ў тым, што я заўсёды нашу будучыню бачыў толькі ў шчыльнай сувязі з Расеяй. Мы не глядзім на Расею толькі як на ворага. У Расеі самой шмат клопатаў, і яны ўзьнікаюць не таму, што так хочацца, а таму, што там проста ня ведаюць, што рабіць. Аднак чачэнскі народ ніколі не пагодзіцца фармальна быць у складзе Расеі.

**Time: Што магла б атрымаць Расея ад прызнаньня незалежнасьці Чачэніі?**

Дж.Д.: Найперш быў бы ліквідаваны галоўны на Каўказе цэнтар нестабільнасьці. У адваротным выпадку наступны цэнтар утворыцца бліжэйшым часам у Дагестане. Падругое, Расеі не спатрэбіцца траціць трыльёны рублёў, бо пасьля ўрэгуляваньня канфлікту мы не зьбіраемся патрабаваць ад Расеі грошы. Мы зможам супольна выкарыстоўваць нетры гэтай зямлі, уключна з даходамі ад праезду транспарту праз геаграфічна важную тэрыторыю.

**Time: Перамога камуністаў на прэзыдэнцкіх выбарах у Расеі магла б зьмяніць сытуацыю ў Чачэніі?**

Дж.Д.: Гэта ня мае ніякага значэньня. Камуністы або фашысты, яны заўсёды хварэлі на расейскую манію – дамінаваць у сьвеце. Але ж калі яны пераможуць, ім будзе трэба добра папрацаваць, каб паказаць сваю прыхільнасьць да закону і дэмакратыі, бо цяперашні рэжым – абсалютна крымінальны.

*Падрыхтаваў Уладзімер Слабін*

№ 4/96
8 красавіка — 14 красавіка

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 12 палосаў патрэбнае інфармацыі

# ІНФАРМАТАР
НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ
BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ




Доля вакансіяў для працоўных працягвае зьмяншацца. Рэзка зьмянілася таксама прафэсійна-кваліфікацыйная структура попыту на працоўную сілу. Асабліва выразна гэтая зьмена адлюстравалася ў штоквартальным Сьпісе прафэсіяў, якія карыстаюцца попытам на рынку працы гораду. Чытайце больш падрабязна на стар. 2 у нашай сталай рубрыцы **БІРЖА ПРАЦЫ**






Пра тое, як кінуць паліць, чытайце ў нашай новай сталай рубрыцы **ЗДАРОЎЕ** на стар. 4



Мы скончваем распачатую ў нумарах 2 і 3 ІНФАРМАТАРА прэзэнтацыю дзяржаўных і камэрцыйных ВНУ г. Менску, што прапануюць платнае навучаньне. Чытайце ў наступных нумарах у рубрыцы **АДУКАЦЫЯ**: Сярэдняя і сярэдне-спэцыяльная адукацыя ў Менску; Адукацыя ў ЗША.

## Менскі рынак кампакт-дыскаў

сёньня прэзэнтуе фірма **"Новы Гук"**. Сьпіс з сотні кампакт-дыскаў, якія дадуць Вам магчымасьць прасачыць тэндэнцыю коштаўтварэньня на гэты прадукт у залежнасьці ад жанру музыкі, краіны вытворцы CD і папулярнасьці выканаўцы. Клясыка, фольк, кантры, хэві-мэтал-рок, опэра, поп-музыка — колькі што каштуе, чытайце ў рубрыцы **РЫНАК** **на стар. 3.**





У рубрыцы **ГАСПАДАРКА** на шматлікія просьбы нашых чытачоў мы зьмяшчаем

## МЕСЯЦОВЫ ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР

на 1996 год. У гэтым календары пададзеныя аптымальныя тэрміны пасадкі найбольш распаўсюджаных культураў гародніны. Разам з тым аўтар календара В. Васілевіч зьвяртае ўвагу на тое, што гэты каляндар не выключае працу і ў іншыя дні, акрамя тых, якія пазначаны як неспрыяльныя і непажаданыя. Каляндар разьлічаны да канца году, што дае магчымасьць карыстацца ім штодня пры вырошчваньні гародніны ў ацяпляльных парніках, на гаўбцах і ў хатніх умовах.

Глядзіце каляндар на стар. 10




**На гэтым тыдні канал** ARTE **прэзэнтуе:**

**Панядзелак 8.04** — У тэме вечара "Жуль Вэрн" м/ф "Падарожжа да цэнтру Зямлі". Рэж. Анры Левін (ЗША 1959) — 01.35; "Чатыры сотні ўдараў" (Францыя 1959). Рэж. Францua Труфо — 21.45. "Мона Ліза" т/ф (Ірляндыя 1986). Рэж. Нэйл Джордан — 23.25.

**Аўторак 9.04** — У тэме вечара "Квадратура сэксу" м/ф "Голы слуга" (Вялікабрытанія 1975). Рэж. Джэк Голд — 22.45.

**Серада 10.04** — Музыка. "Сакрэт Афэнбаха". Фільм-опэра (Нямеччына 1996) — 22.45. "Ніколі ў нядзелю" м/ф (Грэцыя-ЗША 1960). Рэж. Жуль Дасэн — 00.15.

**Чацьвер 11.04** — "Туман" м/ф (Нямеччына 1995). Рэж. Іван Філа — 01.20. "Генэрал" нямы фільм (ЗША 1926). Рэж. Бастэр Кітан — 02.20. Поп-галерэя — Майкл Джэксан — 01.05.

**Пятніца 12.04** — "Распуцін" д/ф (Нямеччына 1996).

**Субота 13.04** — Поп-галерэя — "Пінк Флёйд" — 23.50.

**Нядзеля 14.04** — У тэме вечара "Бокс" м/ф "Шалёны бык". Рэж. Мартын Скарсэзэ (ЗША 1980) — 21.45.

## РАДЫЁАНОНС

Праграма "Дыялёг" — гэта аналіз самых істотных палітычных падзеяў гэтага тыдня. У працэсе вольнай дыскусіі

ўдзельнікі праграмы выказваюць розныя пункты гледжаньня, знаёмства зь якімі дапаможа Вам скласьці ўласную думку.

У штотыднёвай дыскусіі "Дыялёг" бяруць сталы ўдзел два вядомыя амэрыканскія палітычныя аглядальнікі, якія гавораць па-расейску — Дзьмітры Саймс і Леон Арон. Апрача таго, як госьці на "Дыялёг" запрашаюцца знаныя журналісты, вучоныя, палітыкі, дзяржаўныя дзеячы. Праграма перадаецца штачацьвер у асноўных вечаровых праграмах "Голасу Амэрыкі". Вядзе праграму Ўладзімер Марцін.



Хто ты? Чалавек слабахарактарны, неўраўнаважаны і бесклапотны? Альбо належыш да ліку людзей настойлівых і з дастатковым пачуцьцём адказнасьці? Адкажы сабе на гэтае пытаньне, прачытаўшы наш тэст "Ці моцны ў Вас характар?"

## КОШТЫ НА РЭКЛЯМУ Ў ГАЗЭЦЕ "НАША НІВА" І ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ДАДАТКУ "ІНФАРМАТАР"

| | "НАША НІВА" | "ІНФАРМАТАР" |
|---|---|---|
| Базавая стаўка ч/б | $0,5 см.кв. | $0,4 см.кв. |
| Замова ў рэклямным бюро | $0,5 см.кв. | $0,4 см.кв. |
| Замова праз тэлефон | $0,6 см.кв. | $0,5 см.кв. |
| Першая паласа | ч/б — $1 см.кв. Колер (ня меней за 100 см.кв.) — $2,5 см.кв. | ч/б — $0,9 см.кв. |
| Радковая рэклама на паласе "Біржа працы" | | 5.000 руб. (зьмяшчаецца запар у двух нумарах) |
| Колер | ня меней за 50 см.кв. — $1 | ня меней за 20 см.кв. — $1,5 см.кв. |
| TV—праграма | | ч/б — $1 см.кв. колер — $1,5 см.кв. (ня меней за 50 см.кв.) |

Замовіць рэкляму можна праз тэлефон 36—76—75 з 10.00 да 20.00 штодня ці на адрасе: вул. Пуліхава, 29, кв. 61 да 18.00.

Пры гэтых коштах ня ўлічваецца выраб арыгінал-макету.

**Падпісны кошт** **12.000 на месяц**
**36.000 на квартал**

*** Прадугледжаны скідкі на колькасьць выхадаў і плошчу рэклямных аб'яваў**

Падпіска на газэту
**"НАША НІВА"**
праз пошту і "САЮЗДРУК"
**індэкс 63125**
**Падпіска праз недзяржаўную сетку дастаўкі**
тэлефон 29-22-10 (Цыбульскі Леанід)

# МЕСЯЦОВЫ ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР НА 1996 ГОД

| КУЛЬТУРЫ | ХАРАКТАРЫСТЫКА ДЗЁН | СТУДЗЕНЬ | ЛЮТЫ | САКАВІК | КРАСАВІК | ТРАВЕНЬ | ЧЭРВЕНЬ | ЛІПЕНЬ | ЖНІВЕНЬ | ВЕРАСЕНЬ | КАСТРЫЧНІК | ЛІСТАПАД | СЬНЕЖАНЬ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Бакляжаны, кабачкі,** | найлепшыя | 5 | 1,2,28,29 | 27,28 | 2,3 | 2,28-31 | 24-28 | 24,25 | - | 25,26 | 22,23 | 19 | - |
| **патысоны, гарбуз** | добрыя - | 20 | - | 23,24 | 20-22 | 17,18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14,15 | - | - | |
| | іншыя спрыяльныя | 23,24 | - | 22,23 | 30 | 3 | - | - | - | - | - | - | - |
| **Бабовыя** | найлепшыя | 1,5,27,28 | 1,2,28,29 | 27,28 | 2,3 | 2,28-31 24-28 | 24,25 | - | 25,26 | 22,23 | 19,23,24 | 20,21 | |
| | добрыя - | 20,23-25 | 22,23 | 19 | 20-22 | 17,18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14,15 | - | - | |
| | іншыя спрыяльныя | 23,24 | - | - | 30 | 3 | - | - | - | - | 26 | - | - |
| **Капуста белакачанная** | найлепшыя | 27 | 20,23-25 | 22,23 | 19,23,24 | 20-22 | 17-18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14-15 | - | - |
| | добрыя | 28 | 1,2,28,29 | 27,28 | 2,3 | 2,28-31 24-28 | 24,25 | - | 25,26 | 22,23 | 19,23,24 | 20,21 | |
| | іншыя спрыяльныя | 5 | - | - | 30 | 3 | - | - | - | - | 26 | - | - |
| **Капуста чырвона-** | найлепшыя - | 23-25 | - | 23,24 | 20-22 | 17,18 | - | - | 19 | 16,17 | 12,13 | - | |
| **качанная** | добрыя | 5 | 1,2 | 27,28 | - | - | 1,29 | 26,27 | 22,23 | 20 | - | - | - |
| | іншыя спрыяльныя | 23,24 | 28,29 | - | 19 | - | 3,31 | 26-28,30 | 24,25 | - | - | 14,15 | - |
| **Капуста квяцістая,** | найлепшыя | 20,21 | 17 | 14,15 | - | - | | | | | | | |
| **брокалі** | добрыя | 27 | 23-25 | - | 19 | 3,31 | 17,18 | 24,25 | - | - | - | - | - |
| | іншыя спрыяльныя | 23,24,28 | 28,29 | 22,23,27,28 | 23,24 | 20-22 | 26-28 | - | - | 25,26 | - | - | 20,21 |
| **Бульба** | найлепшыя | 6,12,13 | 8-12 7-12 | 4-10 | 4-8 | 2-4 | 1 | 5 | - | 25,26 | 22,23 | 19 | - |
| | іншыя спрыяльныя | 5 | 28,29 | 21 | - | 3 | - | - | - | - | 24,25 | - | 19 |
| **Таматы** | найлепшыя | 6 | 1,2,28,29 | 27,28 | - | 31 | 26,27 | 24,25 | - | 25,26 | 22,23 | 19 | - |
| | добрыя - | 20 | - | 23,24 | 20-22 | 17,18 | - | 20,21 | 16,17 | 24,25 | 21,22 | 19 | |
| | іншыя спрыяльныя | 25,26 | 21,22 | 21 | - | 3 | 28 | - | - | - | - | - | - |
| **Рэдзькаўка** | найлепшыя | 12,13 | 8-12 | 7-10 | 4-8 | 7,8 | 3,4,7,8 1,5,6 | 1,2,5,29 | 2,3,29,30 | 27 | - | - | |
| | добрыя | 14-16 | 15,16 | 11-14 | 9,10 | 4-6,11,12 | 2 | 9,10 | 6 | - | 5,11 | 1,8,9,27-29 | 5-8,25,26 |
| | іншыя спрыяльныя | 17,18 | 13,14 | - | - | - | - | 14 | 10,11 | 6,7 | 4,31 | - | 9 |
| **Рэдзька, рэпа, бручка** | найлепшыя | 12,13 8-12 | 7-10 | 4-8 | 7,8 | 3,4,7,8 1,5,6 | 1,2,5,29 | 2,3,29,30 | 4,27,31 | 1,27-29 | 25,26 | | |
| | добрыя | 1 | 4-16 | 15,16 | 11-14 | 9,10 | 4-6,11,12 | 2 | 9,10,14 | 6,10,11 6,7 | 5,11 | 8,9 | 5-8 |
| | іншыя спрыяльныя | 17,18 | 13,14 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 9 |
| **Салата** | найлепшыя | 23,24 | 20,23-25 | 22,23 | 19,23,24 | 20-22 | 17,18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14,15 | - | - |
| | добрыя | 25,26 | 1,2,21,22 | 21,27,28 | 2,3 | 2,28-31 24-28 | 24,25 | - | 25,26 | 22,23 | 19,23,24 | 20,21 | |
| | іншыя спрыяльныя | 5 | 28,29 | - | 30 | 3 | - | - | - | - | 24-26 | 21,22 | 19 |
| **Буракі** | найлепшыя | 12-15 | 8,12-15,16 | 7-10,13,14 | 4-6,10,14,15 | 4,7,8,11,12 | 3,4,7,8 | 1,5,6,9,10,14 | 1,2,5,10,11,29 | 2,3,6,7,29,30 | 4,5,11,27,31 | 1,8,9,27-29 | 5-8,25,26 |
| | добрыя | 16 | - | - | 9 | 5,6 | 12,13 | - | - | - | - | - | - |
| | іншыя спрыяльныя | 17,18 | 13,14 | 11,12 | 7,8 | 16 | 2 | - | - | - | - | - | 9 |
| **Кроп** | найлепшыя | 23-24 | 20 | - | 23,24 | 20-22 | 17,18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14-15 | - | - |
| | добрыя | 5 | 1,2,23-25 | 22,23,27,28 | 19 | 2,28-31 24-28 | 24,25 | 25 | 21,22,25,26 | 18,19,22,23 | 19 | - | |
| | іншыя спрыяльныя | 1,27,28 28,29 | - | - | 3 | - | - | 24 | - | 26 | 23,24 | 20,21 | |
| **Хрэн** | найлепшыя - | - | - | 14,15 | 11,12 | 7,8 | - | - | - | - | - | - | - |
| | добрыя | 14-16 | 15,16 | 13,14 | - | - | - | 5,6 | 6 | 2,3 | 27 | 8,9 | 7,8 |
| | іншыя спрыяльныя | 12,13 | 11,12 | - | 4,10 | 4,7,8 | 3,4 | - | 5 | - | 11 | - | 5,6 |
| **Часнык** | найлепшыя | 14-18 11-14 | 9-12 | 5-8 | 4,6 | 2 | - | 5,6 | - | - | - | 7,9 | |
| | добрыя - | 15,16 | 13,14 | 9-10 | 7,8 | 3,4,12,13 | 1,9,10 - | 2,3 | 27 | - | - | - | |
| | іншыя спрыяльныя | 6 | - | - | - | 16 | - | - | - | - | - | - | - |
| **Шпінат** | найлепшыя | 23,24 20 | - | 23,24 | 20-22 | 17,18 | - | 20,21 | 16,17 | 14,15 | - | - | |
| | добрыя | 5,25,26 | 1,2,21,22 | 21,27,28 | - | 2,28-31 26,27 | 24,25 | - | 25,26 | 22,23 | 19 | - | |
| | іншыя спрыяльныя | 27,28 | 28,29 | - | - | - | - | - | - | - | 24,25 | 21,22 | 19 |
| Дні, неспрыяльныя для пасадкі ўсялякае культуры | | 19-22 | 17-19 | 15-20 | 12,13,17,18 | 9,10,17-19 | 5,6,15,16 | 2,4,15,16,30,31 | 13-15,26-28 | 12,13,23,24 | 12,13,20,21 | 10,11,16-18 | 9-14 |
| Дні, у якія пасадка гароднiны непажаданая | | 7-9 | 3-5 | 2,3,29-31 | 25-27 | 23,24 | 19-21 | 17,18 | 12 | 9-11 | 6-8 | 2-4,30,31 | 1,27-29 |

# НЕДЗЯРЖАЎНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ І ПАДВЫШЭНЬНЯ КВАЛІФІКАЦЫІ

## НЕДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ БІЗНЭСОВАГА АДМІНІСТРАВАНЬНЯ

Год заснаваньня: **1994 г.**
Заснавальнік:
**Фонд разьвіцьця і падтрымкі незалежных навукі і вышэйшае школы.**
Адрэса:
**220121, г. Менск, вул. Прытыцкага, 62, к. 318.**
Тэлефон:
**53-12-16.**
Рэктар:
**Бязьлюдаў Артур Восіпавіч, доктар эканамічных навук.**
Ліцэнзія:
**N 49 Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусі ад 30 сьнежня 1994 году.**
Інстытут акрэдытаваны на права выдачы дыплёму дзяржаўнага ўзору ў 1994 годзе, пасьведчаньне №128 Міністэрства адукацыі і навукі РБ ад 1 студзеня 1995 г.
Прыём на перападрыхтоўку:
Спэцыяльнасьць:
**Эканоміка і кіраваньне вытворчасьцю.**
Кваліфікацыя:
Эканаміст-мэнэджэр.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Эканоміка й кіраваньне прадпрыемствам.**
Кваліфікацыя:
інжынэр-эканаміст.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Фінансы і крэдыт.**
Кваліфікацыя:
Эканаміст.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Бугальтарскі ўлік, аналіз і аўдыт.**
Кваліфікацыя:
Эканаміст.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Міжнародныя эканамічныя зносіны.**
Кваліфікацыя:
Эканаміст-мэнэджэр.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Камэрцыйная дзейнасьць.**
Кваліфікацыя:
Эканаміст-мэнэджэр.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Актуарная матэматыка.**
Кваліфікацыя:
Матэматык-фінансіст.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Мэнэджмэнт.**
Кваліфікацыя:
Эканаміст-мэнэджэр.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Маркетынг.**
Кваліфікацыя:
Мэнэджэр.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Правазнаўства.**
Кваліфікацыя:
Юрыст.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Міжнароднае права.**
Кваліфікацыя:
Юрыст-міжнароднік.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Сацыялёгія.**
Кваліфікацыя:
Сацыёляг.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Паліталёгія.**
Кваліфікацыя:
Паліталяг.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Псыхалёгія.**
Кваліфікацыя:
Псыхоляг.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
Спэцыяльнасьць:
**Журналістыка.**
Кваліфікацыя:
Журналіст.
Умовы прыёму:
Залічэньне на падставе конкурснага адбору.
**Кошт для ўсіх спэцыяльнасьцяў — 600 $.**
Адукацыйная база: сярэдняя і вышэйшая адукацыя.
Форма навучаньня: дзённая і завочная.
Тэрмін навучаньня: **10 месяцаў (дзённая) і 20 месяцаў (завочная).**
Неабходныя дакумэнты:
**-заява на імя рэктара;**
**-дакумэнт аб адукацыі (арыгінал);**
**-мэдычная даведка па формы 086/У;**
**-6 фатакартак памерам 3х4 см.**
Інстытут ажыцьцяўляе таксама навучаньне на курсах: бугальтараў; супрацоўнікаў банку, фінансавых кампаніяў; кіраўнікоў вышэйшага і сярэдняга рангу; прадпрымальнікаў; мэнэджэраў; сакратароў-рэфэрэнтаў; стратэгічнага пляінаваньня і прагназаваньня дзейнасьці прадпрыемстваў; сыстэмнага праектаваньня вытворчасьці; замежных моваў; спэцыялістаў масажу, біяэнэргетыкі, гіпнозу. Тэрмін навучаньня ад 1 да 9 месяцаў.

## МІЖНАРОДНЫ ІНСТЫТУТ МЭНЭДЖМЭНТУ (МІМ-БЕЛАРУСЬ)

Год заснаваньня: **1993 г.**
Заснавальнік:
**Беларуска-нямецкае СП МІМ-Беларусь.**
Адрэса:
**220050, г. Менск, вул. К.Маркса, 18.**
Тэлефоны:
**27-76-34, 27-76-59,** факс: **27-13-30.**
Рэктар:
**Цярэшчанка Віктар Іванавіч, кандыдат эканамічных навук.**
Ліцэнзія:
**N 24 Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусі ад 1 сьнежня 1993 году.**
Інстытут акрэдытаваны на права выдачы дыплёму дзяржаўнага ўзору, пасьведчаньне №63 Міністэрства адукацыі і навукі РБ ад 5 траўня 1995 г.
Прыём на перападрыхтоўку:
Спэцыяльнасьць:
**Міжнародныя эканамічныя зносіны.**
Кваліфікацыя:
Мэнэджэр у галіне міжнароднай эканамічнай дзейнасьці.
Умовы прыёму:
**Сумоўе.**
Кошт:
**650 $ за год.**
Спэцыяльнасьць:
**Міжнародныя зносіны.**
Кваліфікацыя:
Спэцыяліст-міжнароднік (дыплямат);
эканаміст-міжнароднік (гандлёвы прадстаўнік).
Умовы прыёму:
**Сумоўе.**
Кошт:
**650 $ за год.**
Адукацыйная база: вышэйшая адукацыя.
Форма навучаньня: дзённая і завочная.
Тэрмін навучаньня: **9 месяцаў (дз) і 1 год і 8 месяцоў (з).**
Прыём дакумэнтаў: **з 15 жніўня па 1 кастрычніка.**
Іспыты: **сумоўе ў тыя ж тэрміны.**
Пачатак заняткаў: **1 кастрычніка.**
Неабходныя дакумэнты:
**-заява на імя рэктара;**
**-дакумэнт аб адукацыі (арыгінал);**
**-мэдычная даведка формы 086/У;**
**-выпіска з працоўнае кніжкі;**
**-дамова аб аплаце навучаньня;**
**-3 фатакарткі памерам 3х4 см.**

## НЕДЗЯРЖАЎНАЕ НАВУЧАЛЬНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА "АКАДЭМІЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА І САЦЫЯНОМІІ".

Год заснаваньня: **1993 г.**
Заснавальнік:
**Менскае ТАА падвышэньня кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (зарэгістравана ў Франкфурцена-Майне, Нямеччына).**
Адрэса:
**220038, г. Менск, зав. Уральскі, 15.**
Тэлефон:
**35-22-22,** факс: **35-22-22.**
Рэктар:
**Пусель Уладзімер Уладзімеравіч, кандыдат эканам. навук.**
Ліцэнзія:
**N 23 Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусі ад 4 жніўня 1993 году.**
Акадэмія акрэдытавана на права выдачы дыплёму дзяржаўнага ўзору, пасьведчаньне №54 Міністэрства адукацыі і навукі РБ, сьнежань 1993 г.
Акадэмія прапануе наступныя курсы:
1) **Падрыхтоўка фінансістаў вышэйшае катэгорыі на базе вышэйшай адукацыі.** Фінансавы мэнэджмэнт. Форма навучаньня вечаровая. Тэрмін навучаньня: 3 месяцы.
2) **Рынак каштоўных папераў.** На базе сярэдняй ці сярэдне-спэцыяльнай адукацыі. Выдаецца сэртыфікат на права працы з каштоўнымі паперамі. Форма навучаньня вечаровая. Тэрмін навучаньня: **2 тыдні.**
Прапануюцца таксама курсы:
**Асновы прадпрымальніцтва** (3 месяцы).
**Падвышэньне кваліфікацыі галоўных бугальтараў усіх формаў уласнасьці** (3 тыдні).
**Ангельская мова** (3 месяцы).
**Падрыхтоўка мэнэджэраў міжнароднай эканамічнай дзейнасьці** (6 месяцаў).
Умовы прыёму:
**Групы фармуюцца паводле паступленьня заяваў.**
Кошт:
Фінансавы мэнэджмэнт. **Для пр. асобаў: $78; для юр. асобаў: $88.**
Рынак каштоўных папераў. **Для прыватных асобаў: $95; для юр. асобаў: $105.**

Пасьля заканьчэньня курсаў паводле вынікаў дзяржіспыту выдаецца сэртыфікат эўрапейскага ўзору.
Вучэбныя групы фармуюцца паводле заявак.

Неабходныя ўмовы:
**-копія дакумэнта аб аплаце;**
**-дакумэнт аб адукацыі (пры неабходнасьці).**

**Найлепшае ўкладаньне грошай — прэстыжная адукацыя ў прыватных школах Вялікабрытаніі**

Усяго **7%** ад агульнай колькасьці навучэнцаў складаюць вучні прыватных школаў. Аднак іх выпускнікі — гэта **25%** студэнтаў унівэрсытэтаў Вялікабрытаніі і ўжо **50%** — студэнты сусьветнавядомых Оксфарду і Кэмбрыджу.
Паводле анкетных звестак школьніка і з улікам вашых фінансавых мажлівасьцяў **ISIS International** падбярэ адну з 1355 прыватных закрытых школаў менавіта для вашага дзіцяці. Зацікавіліся?

**Усе падрабязнасьці па тэлефонах (2)33-01-97, (2)43-45-73**

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ

(Працяг. Пачатак у "Інфарматары" №3)

### Менскі дзяржаўны лінгвістычны ўнівэрсытэт

*Адрэса: 220662, г. Менск, вул. Захарава, 21*
*Тэл.: 36-71-14, 36-76-32, 33-22-54*
*Факс: 36-75-04*
*Рэктар: Макараў Уладзімер Васілевіч, доктар філялягічных навук (33-05-44)*

Прыём:

| Факультэт | Спэцыяльнасьць | Іспыты |
| --- | --- | --- |
| перакладчыцкі | перакладчык-рэфэрэнт зь дзьвюх моваў у галіне міжнароднай эканамічнай дзейнасьці і міжнародных зносінаў (ангельская, нямецкая, француская мовы) | замежная мова (вусна); замежная мова (пісьмова – лексычна-граматычны тэст); аўдыяваньне (пісьмова) на замежнай мове; беларуская (расейская) мова (дыктоўка) |
| ангельскай, францускай, нямецкае моваў | асноўная й другая замежныя мовы | замежная мова (вусна); замежная мова (пісьмова – лексычна-граматычны тэст); аўдыяваньне (пісьмова) на замежнай мове; беларуская (расейская) мова (дыктоўка) |
| | замежная мова, беларуская мова й літаратура | замежная мова (вусна); замежная мова (пісьмова – лексычна-граматычны тэст); беларуская мова (дыктоўка); беларуская мова (вусна) |
| гішпанскае мовы | гішпанская мова й другая замежная мова | замежная мова (вусна); замежная мова (пісьмова – лексычна-граматычны тэст) |
| заходне-эўрапейскіх моваў | перакладчык-рэфэрэнт з ангельскай, нямецкай, францускае моваў | замежная мова (вусна); замежная мова (пісьмова – лексычна-граматычны тэст); беларуская (расейская) мова (дыктоўка) (залік/незалік) |

Заўвага да табліцы.

Навучаньне на факультэце заходнеэўрапейскіх моваў толькі платнае (прыблізны кошт 100 мінімальных заробкаў за год).
Паступоўцы на спэцыяльнасьць "замежная мова, беларуская мова й літаратура" удзельнічаюць у асобным конкурсе.
Адукацыйная база: сярэдняя адукацыя.
Форма навучаньня: дзённая.
Тэрмін навучаньня: 4 гады (5 гадоў — на факультэтах ангельскай, нямецкай, францускай, гішпанскае моваў).
Прыём дакумэнтаў: з 26 чэрвеня да 15 ліпеня (на факультэт заходнеэўрапейскіх моваў — з 25 ліпеня).
На завочным аддзяленьні ўнівэрсытэту рыхтуюцца настаўнікі нямецкае мовы для школаў РБ.
Тэрмін навучаньня 5 гадоў.
Прыём дакумэнтаў з 26 чэрвеня да 15 ліпеня, здача іспытаў з 17 ліпеня.
Іспыты: нямецкая мова (вусна); нямецкая мова (пісьмова — лексычна-граматычны тэст); беларуская (расейская) мова (дыктоўка).
Ёсьць таксама магчымасьць атрымаць адукацыю платна для асобаў, якія здалі ўступныя іспыты, але не прайшлі конкурс.
Прыблізны кошт навучаньня: 100 (дз) і 50 (з) мінімальных заробкаў за год.
Другую вышэйшую адукацыю можна атрымаць толькі платна.
Без аплаты прымаюцца:
— воіны-інтэрнацыяналісты;
— асобы, якім супрацьпаказана праца ў атрыманай раней спэцыяльнасьці праз пагаршэньне стану здароўя пры наяўнасьці дакумэнту мэдычна-рэабілітацыйнай экспэртнай камісіі;
— асобы, якія пераехалі зь сямейных абставінаў на новае месца жыхарства, дзе адсутнічае праца ў спэцыяльнасьці, альбо згубілі працу, пры што сьведчыць дакумэнт службы занятасьці насельніцтва;
— пэдагагічныя работнікі пры паступленьні на іншую пэдагагічную спэцыяльнасьць пры наяўнасьці хадайніцтва зь месца працы.
Падрыхтоўчыя курсы: з 27 жніўня — 10 месяцаў (тэл. 36-76-63, 33-21-43).

Неабходныя дакумэнты:

— заява на імя рэктара;
— дакумэнт аб сярэдняй адукацыі (арыгінал альбо копія дыплёму);
— мэдычная даведка формы 086/У;
— выпіска з працоўнае кніжкі (пры завочнай форме навучаньня);
— 6 фотакартак памерам 3х4 см;
— пашпарт (паказваецца асабіста).

### Менскі дзяржаўны мэдычны інстытут

*Адрэса: 220116, г. Менск, пр. Дзяржынскага, 83*
*Тэл.: 72-62-96, 72-63-94*
*Рэктар: Кабарка Аляксей Іванавіч, доктар мэдычных навук (72-61-96)*

Прыём:

| Спэцыяльнасьць | Іспыты |
| --- | --- |
| лекава-прафіляктычная справа | фізыка (вусна); хімія (пісьмова) біялёгія (вусна); беларуская (расейская) мова (дыктоўка) |
| стаматалёгія | хімія (пісьмова); біялёгія (вусна); беларуская (расейская) мова (дыктоўка) |
| мэдычна-прафіляктычная справа | хімія (пісьмова); біялёгія (вусна); беларуская (расейская) мова (дыктоўка) |

Адукацыйная база: сярэдняя адукацыя.
Форма навучаньня: дзённая.
Тэрмін навучаньня: 6 гадоў (5 гадоў — "стаматалёгія").
Прыём дакумэнтаў: з 26 чэрвеня да 15 ліпеня.
Здача іспытаў: з 16 ліпеня.
Ёсьць таксама магчымасьць атрымаць адукацыю платна для асобаў, якія здалі ўступныя іспыты, але не прайшлі конкурс.
Прыблізны кошт навучаньня: $800 за год.

Неабходныя дакумэнты:

— заява на імя рэктара;
— дакумэнт аб сярэдняй адукацыі (арыгінал);
— мэдычная даведка формы 086/У;
— 6 фатакартак памерам 3х4 см;
— пашпарт і вайсковы білет (паказваецца асабіста).

Працяг са старонкі 6

ну 123 (год таму – 42,2 млн.), у Беларусь 74 млн. даляраў (у 1994 годзе – 37).

БЕЛАРУСЬ. У 1995 годзе палякі экспартавалі ў Беларусь вырабаў зь мяса і рыбы на 9 млн. даляраў (у 1994-м – трохі болей, чым на 1,6 млн.). Кошт экспарту мяса і вантробаў узрос з сымбалічных 85 тысячаў даляраў у 1994 годзе да 4,4 млн. у 1995-м. Падвоіўся экспарт садавіны і алейнага семя. Польшча прадала нам таксама шмат кавы, гарбаты і прыправаў (разам блізу 3,4 млн.), какавы (летась – на 10,2 млн. даляраў, гэта значыць у пяць разоў больш, чым у папярэдні сэзон).

Польская фірма "Анімэкс" займаецца продажам у Беларусь пераважна сьвіных паўтушаў, кілбасаў, сала, здору і кансэрваў. Апошнім часам пайшоў гандаль вэнджанай птушкай, а таксама марожанымі качкамі ды гусямі. Гандаль разьвіваецца настолькі хутка, што леташняй восеньню "Анімэкс" адкрыў у Менску сваё прадстаўніцтва – другое па ліку ў краінах былога СССР (першае – у Маскве годам раней). Леташні гандлёвы зварот "Анімэксу" з краінамі былога СССР склаў блізу 20 млн. даляраў.

УКРАІНА. Польскі экспарт ва Ўкраіну амаль удвая большы, чым у Беларусь. Украінцы купляюць польскую мінэральную ваду, сокі, локшыны, вяндліну, рыбныя паўфабрыкаты, а таксама касмэтыку. Летась польскія фірмы прадалі ва Ўкраіну цукру і кандытарскіх вырабаў на 10 млн. даляраў (у 1994 г. – на 3 млн.). Блізу 28 млн. даляраў палякі атрымалі за продаж сокаў, напояў ды алькаголю. Гэтаксама добра ідзе гандаль садавінай і гароднінай – іх Польшча прадала Ўкраіне на 12 млн. даляраў.

КАНКУРЭНЦЫЯ. Разам з тым працаваць на рынку былых краінаў СССР польскім фірмам становіцца ўсё цяжэй. Пакупнікі, акрамя беднасьці, сталі вызначацца патрабавальнасьцю да якасьці. Польскія фірмы не вытрымліваюць канкурэнцыі з экспартэрамі краінаў Эўрапейскага Зьвязу, якія да таго ж прапаноўваюць меншыя кошты.

Летась продаж польскай гародніны зьменшыўся напалову. Так сталася праз увядзеньне Расеяй ды Беларусяй у 1995 г. дадатковага мыта на яблыкі, цыбулю і бульбу. За кожны кіляграм палякі мусілі даплочваць дадаткова 0,2 ЭКЮ. Гэта зьнізіла экспарт, бо прадукцыя сталася даражэйшай за аналягічную заходнюю. Тавар заходніх фірмаў ужо на мяжы быў на адну трацiну таньнейшы. Цяпер гандаль гароднінай ажывіўся, бо са студзеня зьліквідаванае тое дадатковае мыта. Аднак невядома, ці такая сытуацыя будзе трываць доўга. У 1995 г. экспарт польскае гародніны ў Беларусь зьменшыўся з 3,3 да 2,8 млн. даляраў.

Кепска ідзе гандаль Польшчы з балтыйскімі краінамі. Да гэтага спрычынілася глыбокая лібэралізацыя гандлю паміж гэтымі краінамі ды Эўрапейскім Зьвязам, распачатая ў студзені 1995 г. Апрача таго Літва дамовілася пра вольны гандаль з Нарвэгіяй, Швэйцарыяй, Ліхтэнштэйнам, Эстоніяй і Латвіяй.

# Пазыкі прыватныя і фірмовыя

Атрымальнікамі банкаўскіх крэдытаў усё часьцей становяцца ў Польшчы прыватныя асобы. Яшчэ пяць гадоў таму толькі 27-я частка ўсіх банкаўскіх пазыкаў выдавалася на прыватныя патрэбы. Але цяпер, у выніку разьвіцьця сыстэмы крэдытаў, што трэба аддаваць па частках, сытуацыя зьмяняецца на карысьць грамадзянаў. Напрыканцы мінулага году, паводле зьвестак Польскага Нацыянальнага Банку, ужо кожны дзясяты злоты банкаўскіх пазыкаў ішоў на асабістыя патрэбы насельніцтва. Гэткая ж тэндэнцыя назіраецца і сёлета. Кошт пазыкаў насельніцтву ўзрос у студзені на 6,5%, у лютым амаль на 4%. Тым жа часам пазыкі прадпрыемствам павялічыліся на 3,3 і 2,1%.

# Польская прамысловасьць за год

У прыватным сэктары выпуск прадукцыі павялічыўся аж на 26%, а ў дзяржаўным зьменшыўся на 1,3%. Такі эфэкт дасягнуты галоўным чынам у выніку прыватызацыі – у 1995 г. дзейнічала на 10% болей прыватных фірмаў, чым за год да таго.

У 1995 годзе ўсе паказьнікі ў прамысловасьці былі лепшыя, чым у іншых сэктарах гаспадаркі. Паміж іншага, прамысловыя прадпрыемствы прадалі прадукцыі на 9,4% болей, чым летась, аднак на 8% менш, чым у 1989 г.

# Ці патрэбны аборт?

У Польшчы дзейнічае вельмі суворы закон, які абмяжоўвае права жанчыны на аборт, што прымушае тысячы полек рабіць гэтую апэрацыю па-за межамі краіны.

Стаўленьне жыхароў Польшчы да спыненьня цяжарнасьці не зьмяняецца на працягу ўжо некалькіх гадоў. Паводле нядаўніх сацыялягічных дасьледаваньняў, пераважная большасьць (84%) дапускае аборт, калі цяжарнасьць наступіла ў выніку злачынства ці згвалтаваньня. Нараджаць у такой сытуацыі раіць толькі кожны дзясяты. 86% пагаджаюцца зь неабходнасьцю спыніць цяжарнасьць, калі жыцьцю альбо здароўю жанчыны пагражае небясьпека (супраць – 8%), а 82% дапускаюць аборт, калі плод цяжка і незваротна пашкоджаны (супраць – кожны дзясяты).

54% апытаных ня супраць аборту, калі жанчына знаходзіцца ў цяжкой жыцьцёвай сытуацыі (адмоўны адказ – 34%), аднак 58% не падтрымваюць права жанчыны на спыненьне цяжарнасьці, калі яна папросту ня хоча мець дзяцей (за – 32%).

Цяпер закон дазваляе аборт толькі ў першых трох выпадках. Але 62% палякаў выказаліся за зьмену існага парадку. Толькі кожны чацьверты лічыць, што нічога мяняць ня трэба.

*Падрыхтаваў Пятро Рагойша*

**ЛАТВІЯ**

# "І забойцы некалі паміраюць"

Пад такім загалоўкам папулярная газэта "Vakara Zinas" зьмясьціла артыкул пра сьмерць Альфонса Новіка (Alfons Noviks). "Былы генэрал ЧК, наркам унутраных справаў Латвійскай ССР памёр у шпіталі цэнтральнае рыскай турмы, адбываючы пажыцьцёвае зьняволеньне за генацыд супраць латыскага народу, за злачынствы, для якіх у прававых дзяржавах няма тэрміну даўнасьці", – піша газэта.

"Сьмерць Новіка стала гістарычным фактам. Ён – адзіны ў краінах былога СССР чалавек, асуджаны за злачынствы, зьдзейсьненыя ў гады камуністычнай улады, і адзіны, хто цалкам адбыў прысуджанае пакараньне.

Жыцьцёвы шлях Новіка ў нейкім сэнсе тыповы для гэтага крывавага стагодзьдзя ў латыскай гісторыі. Нарадзіўся ў 1908 годзе недалёка ад Лудзы. Вялікімі талентамі ды ведамі не вызначаўся, але ўпарта спрабаваў "выйсьці ў людзі". На пачатку 30-х гадоў наладзіў сувязь зь нелегаламі, якія перайшлі ў свой час дзяржаўную мяжу, кіравалі кампартыяй і прапагандавалі ў Латвіі вартасьці сацыялізму. У 1932 годзе камуніст Новік разам з аднадумцамі-фанатыкамі наведаў запаветны горад Маскву, дзе прыняў удзел у сьвяточным парадзе 1 Мая. Паездка каштавала яму працы – Новік быў звольнены, а праз два гады за камуністычную агітацыю пасаджаны за краты. Вызвалены быў на 20-я ўгодкі абвяшчэньня незалежнасьці Латвійскай Рэспублікі. Жыцьцёвы "ўнівэрсытэт" выхаваў фанатыка і бязьлітаснага супрацоўніка сталінскае рэпрэсіўнае машыны.

У 1940 годзе з прыходам савецкіх танкаў у Латвіі распачаўся тэрор. У асобе Новіка гэтая дыктатура прыдбала вернага паслугача. Прайшоўшы лясную школу, камісар ажыцьцяўляў на справе сталінскую мудрасьць: "Лес сякуць – трэскі ляцяць". Вагоны зь яшчэ жывымі людзьмі былі хадавым экспартным таварам з Латвіі; на безыменных станцыях сыбірскае глухмені з вагонаў, як дровы, выгружалі памерлых ад голаду людзей. Новік быў адзіны міністар з марыянэткавага ўраду Кірхенштэйна, у руках якога была рэальная ўлада. Праўда, "нацкадру" Новіку дапамагаў ягоны намесьнік, прысланы з Масквы забойца і галаварэз Шусьцін. Латыш і габрай рабілі зьверствы, у якіх няма нацыянальнасьці – толькі шмат ахвяраў самых розных нацыянальнасьцяў.

Масавыя дэпартацыі 14 чэрвеня, зьнішчэньне людзей у сутарэньнях дамоў, кроў расстраляных у каналізацыі, выкалатыя вочы, выразаныя геніталіі, сарваныя пазногці, зьвязаныя калючым дротам рукі – такі быў рэальны сацыялізм, які ўзводзіў на сваёй радзіме Новік.

Паводле самых сьціплых падлікаў, ад масавага тэрору пацярпелі паўмільёна жыхароў Латвіі. Эсэсавец Эйхман увайшоў у гісторыю, як бугальтар сьмерці. У Новіка ж не было такога сатанінскага размаху ў экзэкуцыях, як у "вялікіх" латвійскіх чэкістаў Лацыса, Петэрса, Берзіня. Але яго асоба бліскуча і трагічна пацьвярджае: сапраўды, часам і пасрэднасьць можа стаць магутнай. Ваяўнічая і беспакараная пасрэднасьць – сацыяльная база кожнае дыктатуры.

На судзе Новік сваёй віны не прызнаў, ад камуністычных поглядаў не адмовіўся, літасьці не прасіў. Толькі скардзіўся на дрэннае здароўе", – заключае "Vakara Zinas".

Уласьцівыя гэтаму выданьню буйнаплянавыя фотаздымкі паказваюць фізіяномію трупа, партрэты Новіка ў маладыя і пазьнейшыя гады, вопратку арыштанта, паталягаанатамічны стол, дзе адбывалася ўскрыцьцё, крэмацыйную печ і, нарэшце, капсулю з парэшткамі Альфонса Новіка.

*Падрыхтаваў Уладзімер Слабін*

**ПРЭМ'ЕРЫ, ВЭРНІСАЖЫ, КАНЦЭРТЫ**

# Музычныя рэканструкцыі твораў Радзівіла

22 сакавіка ў менскім касьцёле Сьв. Роха адбыўся канцэрт, прысьвечаны 220-м угодкам нараджэньня Антонія Генрыка Радзівіла. Музычныя рэканструкцыі маюць сваю аўдыторыю прыхільнікаў і прадугледжваюць своеасаблівы выканаўчы кантэкст.

Музыка Антонія Радзівіла, створаная пад уплывам раньняга рамантызму й крыху іранічная, неяк куртуазна ўспрымаецца пад нэагатычнымі скляпеньнямі касьцёлу, які ў новым дызайне набывае мадэрнісцкія рысы. Кампазытар нарадзіўся ў Вільні, але большую частку свайго жыцьця правёў у Нямеччыне ці на прускай службе. Ён аўтар музыкі да першае часткі "Фаўста", якую цалкам у Менску пакуль яшчэ не паставілі. Песьні ды фрагмэнт да ідыліі князя Радзівіла маюць камэрны фармат і пасуюць да сяброўскае вечарыны. Найбольш манумэнтальна выступіў хор "Унія", які крыху адышоў ад сваёй ранейшай акадэмічнае стылістыкі й дазваляе сабе цяпер віртуозна-фрывольныя адступленьні.



Хор "Унія"

У другой частцы канцэрту выконваліся творы, прысьвечаныя Антонію Радзівілу. І калі прафэсар Ігар Алоўнікаў сеў за фартэпіяна дзеля выканьня трыо Фрыдэрыка Шапэна, дык усе забыліся пра Радзівіла. Можа, варта было б гэтыя стылёва й маштабна розныя рэчы Шапэна і Радзівіла не супастаўляць. А так у музыку Радзівіла быў прыўнесены нейкі краязнаўчы адгалосак.

Важнае ўдакладненьне – "Беларуская капэла" пад кіраўніцтвам Віктара Скарабагатава працуе надалей дзеля актуалізацыі творчасьці Антонія Радзівіла. Пры больш шырокім прачытаньні гэтая зьява, музыка Радзівіла, можа быць ацэненая паўней.

*A.Dz.*

# Coca-Cola і Янка Купала

"Сьцежкамі Янкі Купалы" – так называецца выстава мастацкае фатаграфіі менскага майстра Альбэрта Цэхановіча, адкрытая ў Магілёўскім гарадзкім Доме культуры. Арганізавалі выставу фота-кінаклюб "Вясёлка" ГДК, фірмы "Kodak-экспрэс" і "Coca-Cola", а таксама БКМФ. 32 творы, зьнятыя на матэрыялах "Kodak", адлюстроўваюць беларускія краявіды, якія калісьці натхнялі народнага паэта. На вэрнісажы А.Цэхановіч паказаў таксама турыстычны даведнік пра Купалавыя мясьціны, у які ўвайшлі і некалькі працаў з экспазыцыі. Выстава працуе да 13 красавіка.



*Валянціна Бондарава*

# Гульні з празрыстымі акварэлямі

У Нацыянальным цэнтры дзіцячае творчасьці (былы Палац піянэраў, рог вуліцаў Энгельса і Кірава) адкрылася выстава мастака Аляксандра Квяткоўскага "Games with liquid water colour". Сам мастак атрымаў адукацыю манумэнталіста і "гульнямі з акварэлямі" заняўся зусім нядаўна. Выстава будзе працаваць да 19 красавіка.

*Андрэй Андрыеўскі*

# Мікалай Пятроў узяў удзел у фэстывалі "Менская вясна"

Два вечары славуты расейскі піяніст граў у канцэртнай залі філярмоніі: сольна і зь Вялікім сымфанічным аркестрам. Здаецца, упершыню пасьля апошняга выступу Сьвятаслава Рыхтара ў Менску давялося выставіць пяць шэрагаў крэслаў нават на сцэне. Назьбіралася нашмат болей людзей, чым у мінулы прыезд маэстра Пятрова.

Рыхтар, як вядома, знайшоў у Берасьці сваё каханьне, і таму часта выступаў у Беларусі. Пятроў, мабыць, проста любіць менскую публіку. І слухачы не адпускалі яго да неміласэрнасьці доўга. На гэты раз піяніст граў на заканчэньне харал з 147-й кантаты "Ісус – мая радасьць" і сыцыліяну з флейтавае санаты Баха, а таксама гучнага Шчадрына.

*Андрэй Дынько*

# Опэра Картэса ў пастаноўцы Пінігіна

Некаторыя крытыкі прадказвалі, што опэра "Візыт дамы" пратрымаецца на сцэне толькі некалькі месяцаў. Наўрад ці гэты пэсымістычны прагноз спраўдзіцца. Яркія сцэнічныя эфэкты, незвычайная пастаноўка, маляўнічае дзеяньне, экспэрымэнтальная сцэнаграфія добра кампэнсуюць пэўную аднастайнасьць музыкі. Можна спрачацца, ці не зачаста сноўдаецца па сцэне антыкварны аўтамабіль, ці ня лішнія ў руках харыстаў рандэлкі і лыжкі, але ж бясспрэчна, што на сцэне адбываецца гратэскавая дзея і што рэжысэр, добра вядомы са сцэны Купалаўскага тэатра, умее паяднаць працу калектыву творцаў.

Сяргей Картэс, кіраўнік менскай опэры, напісаў свой твор у 1989 годзе. У аснову пакладзеная п'еса швэйцарскага драматурга Дзюрэнмата, а пастаноўка ажыцьцёўленая пры дапамозе швэйцарскага фонду "Pro Helvetia".

... У закінутае мястэчка прыяжджае колішняя жыхарка, а цяпер мільянэрка, і абяцае згаладнелым землякам мільён і мільярд пры ўмове, што будзе забіты яе былы каханак...

Кажуць, што неўзабаве ў Менск прыедзе міталягічнае каталёнскае сапрана Мансарат Кабалье, што так праславілася выкананьнем твораў Даніцэці, Бэліні, Расіні, але голас якой, на жаль, перажывае сёньня не найлепшыя часы. Добра было б, каб заможныя аматары культуры ўкладалі грошы ў падтрымку нашых сьпявачак, галасы якіх не саступяць голасу Кабалье.

*Андрэй Дынько*

# Звычайны фашызм-2

Працяг са старонкі 5

## Мастак, гіпэрпсыхоляг, расеец

Мастак-партрэтыст Міхаіл Шэбалін (мянушка — Фат) зарабляе на жыцьцё ў пераходзе пад пляцам Якуба Коласа ў Менску. Калі ісьці з боку Камароўскага рынку, яго можна ўбачыць справа ад сябе. За сьпінаю мастака — рэклямная абвестка з сымбалем, што вельмі падобны на мадэрнізаваную свастыку РНЕ, і нумар тэлефону, празь які можна зьвязацца са школай гіпэрпсыхалёгіі.

У размове са мною Фат сказаў, што з РНЕ выйшаў пасьля рознагалосьсяў з кіраўніцтвам. Аднак я дазволю сабе не паверыць яму, бо гэта стандартны адказ тых, каго, што называецца, засьпяваюць на гарачым. Зусім нядаўна Фат хваліўся, што філія РНЕ ў Беларусі пасьпяхова папаўняе свае шэрагі ў Віцебску, Полацку, Гомелі, што не за гарамі рэгістрацыя філіі ў беларускім Міністэрстве юстыцыі.

“Улады ведаюць пра нас, — прызнаецца Фат. — Са мною не адзін раз гаварыў участковы. У адпаведных органах зьвесткі пра нас ёсьць. Мы не хаваемся”.

Палітычную дзейнасьць мастак-”гіпэрпсыхоляг” пачынаў у СС “Белая Русь”. Аднак РНЕ захапіла яго “большей конкретикой и дисциплиной”.

За восем гадоў маляваньня партрэцікаў палітончык Фата дужа паднасіўся (кішэні абарваліся і ніткі вылазяць); тэчкі, куды ён складае лісты ватману, таксама. Фату пераваліла за 33, у яго кароткая стрыжачка “бокс”, вусы і бародка а-ля Фэлікс Эдмундавіч, наколка на правай руцэ і ад нараджэньня дэфэктнае правае вуха (пляскатае, бяз трочкаў). Што ж да “школы гіпэрпсыхалёгіі”, дык яе няма. Гэта проста фантазія самотнага расейскага чалавека на беларускай зямлі.

## Палітычная кухня РНЕ ў Беларусі: дзейнасьць, “разборкі”, пэрспэктыва

*... деятельность местных русофобов мы расцениваем как местечковый шовинизм и сепаратизм. А это уже преступление перед русской нацией.*

Андрэй Валіулін

Як ужо было сказана вышэй, рэгіянальнае аддзяленьне РНЕ ў Менску арганізавана вясной-летам 1994 году. Ля вытокаў сталі выгнаны з савецкага войска (паводле іншых зьвестак — з ваеннай вучэльні) А.Валіулін (бацька — вайсковец, родам з Падмаскоўя) і яго сябры з СС “Белая Русь”: Анатоль Капылоў (малодшы), Мікалай Герасімчык, Усевалад Янчэўскі. Першая акцыя прыпала на 9 траўня. Выйшлі ў чорных кашулях са свастыкамі, удзельнічалі ў бойцы з вэтэранамі, якія трымалі бел-чырвона-белыя сьцягі. Падзеі адбываліся на Круглай плошчы.

Вясна 1994 году. Канцэрт Б.Акуджавы ў філармоніі. Паколькі вядомы бард і паэт паводле нацыянальнасьці габрай, антэсэміты баркашоўцы і славянасаборцы выстаўляюць пікет. “Байцы” РНЕ стаяць на прыступках будынка, пагражаюць людзям, якія прыйшлі на канцэрт. Некаторым парвалі адзеньне, адну дзяўчыну зьбілі да крыві.

Да восені 94-га ўстойлівым складам каманда Валіуліна зьбіраецца кожны панядзелак каля філармоніі.

03.10.94. На гадавіну расстрэлу “Белага дому” ў Маскву выпраўляюць ганца, які інфармуе А.Баркашова пра існаваньне філіі РНЕ ў Беларусі і вяртаецца назад з партыяй газэтаў “Русский порядок” і пачкам кніг Баркашова “Азбука русского национализма”. Ганец прывозіць наказ менскім баркашоўцам: ісьці на кантакт зь беларускімі патрыётамі і паступова перацягваць іх на свой бок.

Праз два тыдні пасьля названага візыту з Масквы ў Менск прыяжджае нехта Мікалай Сямёнаў, які прывозіць інструкцыі, 10 камплектаў камуфляжу, атрыбутыку РНЕ. Гэтым часам у менскай філіі разгараецца барацьба за ўладу паміж мастаком з Калінінграду М.Шэбаліным і А.Валіуліным. Шэбалін групаваў вакол сябе людзей, ставячы на антысэмітызм.

Барацьба за лідарства працягваецца. Гэтым разам паміж Валіуліным і былым начштабу РНЕ Юрыем Каваленкам. Унук паліцая і аматар алькагольных напояў Каваленка ад пачатку канфліктаваў з Валіуліным з-за боек з байцамі РНЕ на бытавой глебе. Летам 95-га ў рэстаране “Патсдам” ён спрабаваў згвалціць нейкую Олю. У гэтыя ж самыя дні Каваленка хацеў парваць з РНЕ з-за “бязьдзейньня” Валіуліна, жадаючы стварыць уласную арганізацыю, на што, як ён меркаваў, грошы можа даць сам Лукашэнка, толькі, маўляў, трэба ўсё прадумаць. З такою прапановай Каваленка зьвяртаўся да беларускай патрыятычнай арганізацыі “Правы Рэванш”.



18 сьнежня 1994 году. Пазначаныя нумарамі: 1 – кіраўнік філіі РНЕ ў Менску А.Валіулін; 2 – Ц.Клыкоўская.

Пэўны час Каваленка быў выключаны з РНЕ, але з дапамогаю Баркашова аднавіў свае пазыцыі, хлусячы “босу” пра магутнасьць менскае філіі. Змог выбіць грошы з маскоўскага штабу, якія падзяліў паміж філіяй і сабой. Цяпер ён апантаны жаданьнем зусім прыбраць Валіуліна, як прадстаўніка найменш шавіністычнае часткі РНЕ. Спраўкаваў унутраны канфлікт у РНЕ, сутнасьць якога была ў спарадкаваньні шпіёнаманіі, падштурхоўваньні Валіуліна да “паляваньня на ведзьмаў”. Як прыклад — расправа з хлопцам Дзьмітрыем, які прадаваў камуністычныя лісткі на пляцы Якуба Коласа.

Мэта Каваленкі — канчаткова ператварыць філію РНЕ ў каманду рэкету, якая ня мае ніякай ідэалёгіі. Новыя людзі, што прыйшлі ў арганізацыю (чалавек 40), падтрымліваюць яго, бо безыдэйны бандытызм ім нашмат бліжэйшы.

Першае гасьцяваньне А.Валіуліна ў Маскве прыпадае на час, калі цяперашні аматар наведваньня ў Беларусі “русского порядка” быў усяго толькі шараговым членам “Славянскага Сабору”. Тады там яго не заўважылі. Аднак у сьнежні 94-га, калі ён з трыма сябрамі другі раз наведаў маскоўскі штаб РНЕ, яны былі сустрэтыя вельмі цёпла, нават горача.

На момант прыезду Валіуліна насьпяваў раскол РНЕ, які пазьней завяршыўся зыходам К.Фёдарава і часткі маскоўскага батальёну. “Фёдараўцаў”, што засталіся з Баркашовым, апошні ўзяў пад кантроль: пачалося шпегаваньне, апафэозам якога стала забойства асабістага баркашоўскага сувязнога Сазонава. У атачэньні Баркашова зьявіліся людзі, якія ў абыход “патрона” пачалі рабіць на рэкеце вялікія грошы. У выніку “новыя” баркашоўцы разьяжджаюць на іншамарках, адсоўваючы на задні план пазыцыі людзей, якія стваралі РНЕ на ідэалах адраджэньня Расеі. Гэтыя ж “новыя” пачалі напампоўваць рэгіянальных лідараў грашыма і скрайнім шавінізмам.

Сёньня стабільныя грошовыя паступленьні дазваляюць Валіуліну і ягонай групе ажыцьцяўляць досыць актыўную прапаганду ў ВНУ і ПТВ, тым самым папаўняючы свае шэрагі. У час працэсу Азаронка-Пазьняка ў зале суда прысутнічала каля 50-ці чалавек са свастыкаю на рукавох.

26-27 лістапада. Першы зьезд беларускіх патрыётаў. У Віцебск выяжджае група “Славянскага Сабору” (Сяргееў, Бязьвершанка, карэспандэнтка “ЗЮ”, Дудзінаў) і чалавек дзесяць баркашоўцаў на чале з Ю.Каваленкам, які асабліва актыўна дапамагаў міліцыі разганяць Зьезд патрыётаў.

На канец 1994 г. апорная база “фашыкаў” — таварыства” Русь”, членамі якога і ёсьць баркашоўцы. Яны “ахоўваюць” мерапрыемствы “Руси” накшталт культвечароў, кінапраглядаў і інш., якія пачынаюцца з ганаровага шыхтаваньня і прывітальнага воклічу “Слава Росии!” Асаблівую прыхільнасьць да членаў РНЕ выказваюць Гасьцюхін, якога Лукашэнка нядаўна зрабіў народным артыстам, і Азаронак. А.Валіулін за падтрымку ягонай арганізацыі разьлічыўся з Азаронкам дапамогаю ў фабрыкацыі матэрыялаў фільму “Сьмяротныя грахі”.

З 1995 году валіулінцы робяць рэгулярныя паездкі ў Маскву на стажаваньне, якое адбываецца на базе РНЕ ў Нова-Гірэеўскім парку. База дзейнічае з дазволу маскоўскіх уладаў. На грошы маскоўскага цэнтру РНЕ валіулінцы закупілі некалькі адзінак зброі.

## Пагром на Кальварыйскіх могілках

Гэта здарылася на Дзяды ў лістападзе 95-га. Як паведамляе наш інфарматар, у той дзень



Нацыянальная ідэя "па-расейску": члены РНС любяць нямецкае піва і ня любяць амэрыканскі сьцяг.

баркашоўцы арганізавалі папойку на кватэры свайго таварыша, што жыве на вуліцы Сердзіча. Вінныя пары ўзбунтавалі расейскую кровушку, што вылілася ў вайну з надмагільнымі помнікамі на Кальварыйскіх могілках у горадзе-герої Менску.

Паводле факту пагрому ў праваахоўныя органы выклікаліся: Мікалай Герасімчык, нейкая Віялета, старшыня прафкаму студэнтаў журфаку БДУ, сам А.Валіулін, які цьвердзіў, што да разбою на могілках ня мае ніякага дачыненьня. Пошукі пагромшчыкаў так нічога і не далі.




*18 сьнежня 1994 году. Менск. Дом культуры імя Кісялёва. 1 – баркашовец Мікалай Герасімчык пад аховаю беларускай міліцыі: 2 – Ц.Клыкоўская.*

## Як менчукі разагналі фашысцкую сходку, якую дазволілі гарадзкія ўлады

14 сьнежня 1994 году днём каля Опэрнага тэатру адбываўся мітынг, арганізаваны БНФ. Раптам нехта паведаміў, што ў ДК на вуліцы Матусевіча мае адбыцца сустрэча мясцовых "сабораўцаў" з маскоўскімі "гасьцямі" — нацыянал-бальшавіком Э.Лімонавым ды ідэолягам і тэарэтыкам новых расейскіх правых А.Дугіным. Пасьля такой навіны грамадзяне, якія прысутнічалі на мітынгу, вырашылі не дапусьціць правядзеньня ў беларускай сталіцы сходкі мясцовых ды наежджых фашыстаў. Прыехаўшы маршрутнымі аўтобусамі на вуліцу Матусевіча, дзе знаходзіцца згаданы ДК тонкасуконнага камбінату, людзі паспрабавалі прайсьці ў будынак, але дарогу ім перагарадзілі ахоўнікі ў камуфляжнай форме зь бела-жоўта-чорнымі павязкамі на рукавох. Абураныя менчукі ўступілі ў бойку з маладымі цэрбэрамі славяна-расейскай ідэі, расьсеялі іх і завалодалі сытуацыяй у залі. Другая хваля ўдзельнікаў мітынгу канчаткова вымыла "фашыкаў" з Дому культуры. Трэба было бачыць, як яны выскоквалі ў вокны і давалі дзёру праз засьнежанае поле —"байцы" РНЕ і "Славянскага Сабору".

Пры разглядзе крымінальнае справы аб факце фашысцкай сходкі А.Валіулін і ягоныя людзі на працэсе выстаўлялі сябе пацярпелымі. На людзей, якія разганялі сходку, былі заведзены крымінальныя справы.

Празь некалькі дзён пасьля падзеі камуністычная газэта "Мы и время" не прамінула праліць кракадзілавы сьлёзы "по мальчикам", якіх пабілі "бэнэфаўцы". "Советская Белоруссия", рэдактарам якой тады быў Ігар Асінскі, у матэрыяле Віктара Прыходзькі за 20 сьнежня таксама засьведчыла сваю прыхільнасьць да "пакрыўджаных": "На встречу пришли анархисты, баркашовцы, просто любопытные. Было много журналистов. Всё начиналось чинно и благородно. Если не считать пикетировавших сбор "красно-коричневых" немногочисленных активистов-бэнээфовцев". Пашкадавала "любопытных" баркашоўцаў і газэтка "ЗЮ", якую на той час рэдагаваў М.Кацюшэнка. "Вечерний Минск" прамаўчаў, а "Народная газета" дала інфармацыю за подпісам Ц.Клыкоўскай, якая разам зь міліцыяй абараняла "русских мальчиков".

## Расейскі фашызм і беларускія ўлады

Як было ўжо сказана, ідэі расейскіх правых пранікаюць у беларускае грамадзтва пад самымі рознымі шыльдамі. Але фашызацыя нашага грамадзтва была б даволі праблематычнай, калі б імпульсы новага таталітарызму не зыходзілі з самых вярхоў улады. Пасьля вядомага інтэрвію Лукашэнкі нямецкай газэце "Handelsblatt", у якім ён дазволіў сабе станоўчую ацэнку гітлераўскай палітыкі 30-х гадоў, становяцца зразумелымі паводзіны ўладаў ды праваахоўных органаў за апошнія два-тры гады. Прасочым храналёгію падзеяў з удзелам баркашоўцаў-славянасаборшчыкаў і рэакцыю ўладаў.

1994 год, вясна. Згаданы канцэрт Б.Акуджавы. У пікеце разам з баркашоўцамі стаіць артыст Ул.Гасьцюхін, ён публічна разьбівае кружэлку паэта, вэтэрана другой сусьветнай. У пачатку 1996-га Лукашэнка надае Гасьцюхіну званьне народнага.

26-27 лістапада 1994 году. Віцебск. Міліцыя разганяе Першы Зьезд беларускіх патрыётаў. У тым самым часе, са словаў карэспандэнта "Народнай газеты" С.Буткевіча, "па горадзе спакойна дэфілявалі наежджыя зь Менску і мясцовыя актывісты Славянскага Сабору "Белая Русь" з прымкнулымі да іх дзеячамі беларускае філіі ЛДПР ("жырыноўцамі") і малодчыкамі з арганізацыі А.Баркашова РНЕ". Хадзілі яны пад лёзунгамі абсалютна антыбеларускага зьместу ("Наша Родина от Буга до Курилл", "Славянские соколы за единую и неделимую Росиию" ды інш.). Міліцыя не перашкаджала ім і тады, калі яны дэманстравалі спальваньне лялькі беларускага ўніята Язафата Кунцэвіча.

14 сьнежня 94-га. Менск. У ДК тонкасуконнага камбінату баркашоўцы і Славянскі сабор арганізуюць сустрэчу з Дугіным і Лімонавым. Улады даюць для аховы зборышча падразьдзяленьне амону. На пытаньне, чаму арганізацыя сходкі была дапушчана ў прынцыпе, улады не далі адказу й да сёньня.

### "Антыфашысты"

Пра стварэньне ў Менску Грамадзкага антыфашысцкага цэнтру ўпершыню было абвешчана ў жніўні 1994 году. Ініцыятарамі яго стварэньня сталі зусім не "граждане различных национальностей", але прадстаўнікі найперш той нацыі, пра якую В.Шульгін, дэпутат апошняй дарэвалюцыйнай расейскай думы, напісаў кнігу "Что нам в них не нравится...". Гаворка ідзе пра габраяў, якія да сёньня замяняюць свае сапраўдныя прозьвішчы псэўданімамі.

Што да "антыфашысцкага цэнтру", дык тут "кухня" простая: зьявілася магчымасьць на антыфашысцкай праблематыцы зарабіць "бабкі", стварыць яшчэ адно цёплае месца. Нездарма ў размове са мною адзін з заснавальнікаў "Цэнтру" А.Ступнікаў бясконца наракаў на тое, што яны ня могуць займацца зьбіраньнем фактаў адкрыта фашысцкае дзейнасьці пэўных групаў, бо яны грамадзкая арганізацыя. Вось каб гэта былі функцыянэры на зарплаце, яны маглі б тады зьбіраць інфармацыю і г.д. Але тады ўзьнікае пытаньне, навошта такі "антыфашысцкі цэнтар", які ня мае пра дзейнасьць таталітарных групаў у Беларусі нават самых элемэнтарных зьвестак? Хіба для таго, каб у сваёй улётцы "Никогда вновь" передрукоўваць непрафэсійныя матэрыяльчыкі студэнтаў журфаку БДУ, якія беларускіх патрыётаў называюць фашыстамі, а пра РНЕ прамаўляюць з прыдыханьнем?

## Новыя правыя ў Эўропе і сьвеце

У Эўропе нэанацысцкія і нэафашысцкія настроі праявіліся адразу ж пасьля Другой сусьветнай вайны. Росту папулярнасьці прафашысцкіх груповак і партыяў паспрыяла і так званая "халодная вайна". Сёньня крайнія правыя рэваншысцкія рухі ў сьвеце перажываюць чарговы пад'ём. Праўда, адносіны да іх у розных краінах розныя.

Тры гады турмы і 6 тысячаў даляраў штрафу атрымала 19-гадовая студэнтка з каледжу Новай Англіі ў штаце Нью-Гэмпшыр. І за што? За свастыку, якую Мэры Лейбсан намалявала на дзьвярох уласнага пакоя ў студэнцкім інтэрнаце, у холе, а таксама на дзьвярох пакоя сваёй сяброўкі. Кожны малюнак будзе разглядацца як асобнае злачынства. Перад арыштам Мэры выключылі з каледжу...

11 сакавіка ў цэнтры Шаўляў быў падняты літоўскі сьцяг з чырвонаю свастыкай у белым коле. Гэтае месца добра бачнае з вакна шаўляўскага дэпартамэнту дзяржбясьпекі. Пра сьцяг паведаміў дворнік, які прыбіраў цэнтральную плошчу...

У Даніі набірае моц Нацыянал-Сацыялістычны Рух — крайняя правая арганізацыя са штаб-кватэрай у Капэнгагене. Пра маштабы дзейнасьці правых сьведчыць хоць бы той факт, што тут пачала працаваць першая ў Эўропе фашысцкая радыёстанцыя "Аазіс". Кіраўнік дацкіх нэанацыстаў Ян Хансэн лічыць, што іхны радыёголас будуць слухаць каля 200 тысячаў датчанаў. Улады папярэдзілі крайніх правых пра недапушчальнасьць выпуску ў эфір выяўна расісцкіх тэкстаў. У перадачах будзе гучаць пераважна музыка — так званы нацы-рок...

Ізноў адраджаецца ідэя чорнага нацыянал-расізму. І ня дзе-небудзь, а ў забясьпечаных ЗША. Чарнаскуры генэрал Колін Паўэл разглядаецца як сур'ёзны прэтэндэнт на прэзыдэнцкі пост. Што ж адбылося? Ня выключана, што віной усяму — дэмаграфічныя зрухі: рост колькасьці афраамэрыканцаў стаў занадта хуткім і апярэдзіў магчымасьці іх самарэалізацыі. З гэтага факту паўсталі патрабаваньні да белых. Чорны нацыяналізм трансфармуецца ў расізм. А для таго, каб эфэкт супрацьстаяньня амэрыканскаму істэблішмэнту быў яшчэ большы, лідар самага папулярнага руху "чорных" — Нацыі Ісламу Люіс Фарахан разьвіў бурлівую міжнародную дзейнасьць, шукаючы падтрымкі і сярод антыамэрыканскіх арабскіх рэжымаў. "Марш мільёна чорных на Вашынгтон" паказаў, што афраамэрыканцы сталі ў ЗША сілай, зь якою нельга не лічыцца.

*

У немалой ступені чарговаму ўздыму скрайніх правых спрыяе новая геапалітычная сытуацыя, выкліканая распадам СССР і цяпер пагроза таталітарнага рэваншу чырвона-карычневых зыходзіць ня толькі з "старой Эўропы", але і з "новапаўсталай" Расеі, пра што сьведчыць прыклад з філіяй РНЕ ў Беларусі. Адзіная рэальная сіла, якая можа нэўтралізаваць распаўзаньне "праваслаўнага расейскага нацызму" (тэрмін расейскай пісьменьніцы З.Крахмальнікавай) па нашай зямлі — гэта беларускі нацыянальны рух.

P.S. 31 сакавіка 1996 году. Менск. Каля Палаца спорту адбыўся мітынг у падтрымку палітыкі Лукашэнкі. Прысутнічаў і тутэйшы прафашысцкі "бамонд". Міліцыя затрымала баркашоўца са значкай стылізаванае свастыкі на штрыфэлі...

## КНІГА — ПОШТАЙ

**На складзе Фонду "Наша Ніва" маюцца кнігі:**

**1. Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме...** Зборнік інтымнае прозы. — Менск: Сучасная літаратура, 1995. — 310 с.
Кнігі новай сэрыі "Сучасная літаратура" разьлічаныя на поўную самаакупнасьць. Займальныя сюжэты, даверлівы тон, даступнасьць — характарыстыкі гэтай сэрыі.
41.000 БРБ

**2. Адам Глёбус. Скрыжаваньне.** — Менск: БАДППР — "Ковчег", 1993. — 46 с.
Апошні зборнік вершаў Адама Глёбуса. Многія з гэтых тэкстаў сталі агульнавядомымі песьнямі, многія перакладаліся на розныя мовы. Напрыклад, польская крытыка назвала "Скрыжаваньне" лепшай беларускай паэтычнай кніжкай дзесяцігодзьдзя.
7.000 БРБ

**3. Энтані Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** — Менск: БФС — "Эўрафорум", 1995. — 272 с.
Кніга прысьвечана шматлікім трансфармацыям нацыяналізму ў нашым стагодзьдзі, параўнаньню яго з такімі ідэалёгіямі "выратаваньня сьвету", як камунізм, фашызм і расізм.
20.000 БРБ

**4. Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** — Вільня, 1994. — 192 с.
Гісторыя ахвярнага каханьня набожнай жанчыны і безнадзейна хворага мужчыны. Яна — дачка віленскага купца немца Юліяна Мэнке, ён — беларускі палітык і антыквар Іван Луцкевіч.
29.000 БРБ

**5. Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі** / Пераклад з польскай. —Вільня-Менск: "Наша Ніва" — "Мастацкая Літаратура", 1994. — 93 с.
Клясык польскай паэзіі Баляслаў Лесьмян (1878-1937) стварае маляўнічы й зваблівы сьвет інтымных перажываньняў чалавека.
17.000 БРБ

**6. Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** — Менск, 1993. — 352 с.
У кнізе беларускага эміграцыйнага дасьледніка ўсебакова разглядаецца гісторыя і сёньняшні дзень беларускай дыяспары ў Злучаных Штатах Амэрыкі.
29.000 БРБ

**7. Беларускі рок-н-рол: Тэксты** ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс"). — Менск: "Ковчег", 1994. — 64 с.
7.000 БРБ

Каб атрымаць патрэбную Вам кнігу, трэба пералічыць указаную суму грошай на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. Не забудзьцеся падаць свой адрас.

АЛЕСЬ АРКУШ

# ДНІ

14.03. Прыехаў у Менск на сэмінар "Дэмакратычнае лідарства", які ладзяць прадстаўнікі расейскага Цэнтру сацыяльна-практычнай адукацыі "Галубка". Сталіца сустрэла паганым надвор'ем, паўсюднымі міліцыянтамі й сталінскім ампірам (усё шэрае й прыгнятальнае). Сярод "сэмінарыстаў" шмат моладзі; з Гомеля прыехала дзяўчына-"талакоўка", якая нават з маскоўскімі трэнэрамі размаўляла выключна па-беларуску, у мяне склалася ўражаньне, што ніякай іншае мовы яна ня ведае (ёсьць яшчэ дзяўчаты ў нашых "селеньях"!).

Увечары быў у рэдакцыі "Крыніцы". Алесь Разанаў папрасіў тэрмінова адказаць на пытаньне для анкеты пра 21 магчымасьць у гісторыі Беларусі.

У гатэлі "Сьвіцязь" да ночы адшукваў 21-у магчымасьць. Яшчэ ніводзін беларускі палітык не трымаў у руках лёсаносную ніту Арыядны. Скразныя магчымасьці.

15.03. Устаў, уключыў гатэльнае радыё. Былы старшыня цэнтарвыбаркаму, прозьвішча ўжо ня згадваецца, расказваў, якая ў беларусаў дрэнная Канстытуцыя, маўляў, малыя паўнамоцтвы дае прэзыдэнту. Сапраўды, сёньня ж Дзень Канстытуцыі...

А ўчора расейская Дума дэнансавала Белавескія пагадненьні. Back in the USSR! Добры падарунак беларусам у дзень сьвята. Расейскія трэнэры ў гэткай жа разгубленасьці. "Ну што ж, адзін Вярхоўны Савет мы ўжо бралі штурмам", — нібыта пажартаваў Іван з Масквы.

16.03. Урачыстае закрыцьцё сэмінару. Кожны слухач атрымаў па важкім томе "Антологии ненасилия". Разгарнуў на выпадковай старонцы: "198 мэтадаў негвалтоўных дзеяньняў... Адмова грамадзянаў ад супрацоўніцтва з урадам: байкот заканадаўчых органаў; байкот выбараў; байкот працы ў дзяржаўных установах і займаньня дзяржаўных пасадаў; байкот урадавых установаў, агенцтваў ды іншых органаў; выхад з урадавых адукацыйных установаў; байкот падтрымваных урадам арганізацыяў..." Актуальна! Гартаю далей. "Асновы барацьбы супраць перавароту... Вельмі часта народ адчуваў сваю поўную бездапаможнасьць перад абліччам перавароту, асабліва калі ён ажыцьцяўляецца войскам альбо зь ягонай падтрымкай. Аднак цяпер ужо вядома, што пераварот можна перамагчы без пагрозы грамадзянскай вайны: гэта народныя сілы, якія прынялі стратэгію грамадзкай абароны". Адразу відаць, што пісаў амэрыканец. Гэта ў якім-небудзь Нью-Ёрку дасі мурыну кухталя, а назаўтра зьбярэцца маніфэстацыя пратэсту.

17.03. У Полацку сонечны ранак. Вінцэсь Мудроў распавёў пра мясцовыя навіны: у Дзень Канстытуцыі на цэнтральным наваполацкім пляцы бээнэфаўцы выставілі пікет зь лёзунгамі "Абаронім Канстытуцыйны суд — абаронім сябе", "БНФ падтрымлівае законнасьць". Даўно ўжо не мітынгавалі й не пікетавалі...

18.03. У гарадзкой дзіцячай бібліятэцы імя Пушкіна сустракаўся зь дзецьмі — чацьвертая кляса. Расказваў, як робіцца кніга (маю ўласны досьвед). Напрыканцы выступу пачытаў страшылкі з кнігі "Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сіда Рука". Слухачы сьмяяліся ледзь ня з кожнага сказу. Адзін хлопчык спытаў, ці марыць мой сын таксама стаць пісьменьнікам? Не, ня марыць, — бо бачыць, колькі трэба сядзець за пісьмовым сталом.

19.03. Прыслаў ліст з Харкава рэдактар "Українського Засіву" Ігар Бондар-Тэрэшчанка. Прапануе стварыць агульны ўкраінска-беларускі культуралягічны часопіс. Піша, што трэба прысьпешваць час, бо "хто зна, що воно буде далі"... Бракуе добрых перакладчыкаў.

20.03. У Полацку адкрыцьцё выставы жывапісу й графікі Сяргея Цімохава — адразу ў трох гарадзкіх залях. Прыехалі Алесь Разанаў, Віктар Маркавец, Уладзімер Арлоў. На адкрыцьцё сабралося багата людзей. Сяргей, напэўна, галоўны паганскі мастак у Беларусі. Стоды-птушкі, стоды-дрэвы, Дажбог, Белаполь і, натуральна, Вялес. "...ЧАЛАВЕК — гэта гліна, камень, дрэва, гэта сама ЗЯМЛЯ, якая плыве ў прасторы гэтага Сусьвету..." (Радкі з каталёгу выставы).

21.03. Мастацтва неабходна аддзяліць ад дзяржавы гэтаксама як і царкву. За кошт чаго яно будзе існаваць? А за кошт чаго існуе царква? Вось калі людзі панясуць мастаку ўсё, што маюць — яйкі, сала, пірагі, гамбургеры, вось тады й акрыяе Мастацтва.

22.03. Гумянюк прыслаў з Горадні карэктуру "Калосься №4". Часопіс робіцца больш разважлівы і разнастайны. Цэлы блёк матэрыялаў, прысьвечаных памяці Андрэя Пяткевіча.

23.03. Зраніцы еду ў Віцебск. Спачатку патрапіў на спэктакаль Ленкому ў Коласаўскім тэатры. Жан Както, "Кішэнны тэатар". Абдулаў, Збруеў, Алфёрава. Сядзеў і думаў, чаму не ўспрымаю гэтую "зорнасьць"? СэСэСэРаўскі атавізм? Элітарная бутафорыя? Не сучасны кантэкст? Шасьцігадовая дачка наваполацкага мастака Куржалава, якая сядзела побач, сказала сваёй маці: Якая прыгожая люстра! — і адначасова пяць гледачоў узьнялі свае вочы на тэатральную люстру. У тым ліку й я.

А 18-й гадзіне ў Дзіцячай мастацкай школе (Суворава, 3) пачынаўся "Арт-прагноз-96". Сабраўся квет беларускага літаратурнага авангарду. Ладзіў імпрэзу Алесь Пушкін (вечарына абышлася мастаку ў сямсот уласных даляраў). З "бум-бам-літаўцамі" прыехалі Акудовіч, Барысевіч, Лявон Вольскі і Кася Камоцкая. А таксама Гумянюк і Сільнова. Адкрываць гэты мастацкі шабаш Пушкін даручыў мне. Я выйшаў у паліто й сказаў, што доўгі час у сваёй роднай хаце мы хадзілі апранутыя — у ватоўках, бушлатах, шынэлях, кажушках і г.д., але прыйшоў час у сваёй хаце й распрануцца. І пачаў распранацца. Да кашулі!

Нягледзячы на тое, што ўваход быў платны, народу прыйшло процьма. Дзьве гадзіны ўся гэтая маса соўгалася (сядзячых месцаў не было), гаманіла, рагатала, сьпявала песьні, чытала вершы, давала й брала аўтографы.

Напрыканцы вечарыны запрошаныя артысты іголкамі дзікабраза пакінулі свае пісьмёны на адмысловых керамічных пластах. Я напісаў "Мы ўсё адно пера-можам!" і намаляваў "пацыфік". Перанос слова "пераможам" адбыўся незаплянавана й я з задавальненьнем заўважыў яшчэ адзін, патаемны, сэнс сваіх крамзоляў. Можам!

Пушкін паабяцаў умураваць гэтыя пласты ў падмурак сваёй будучай галерэі.

*Полацак*

*Сяргей Астраўцоў*

# БІБЛЕЙСКІ

1.

У шэрых жылых блёках запальваюцца першыя жарынкі лямпачак. Ты шыбуеш доўгай сьнежнай сьцяжынаю. З пагорка на пагорак, налева-направа, агінаючы адзін дом, наступны. За пяць крокаў наперадзе сьпяшаецца дзяўчына у футэрку. Шапка з забітай лісы, галоўка якой завернута назад, бязвока глядзіць на цябе.

Голуб грэецца, адшукаўшы сярод сумётаў панцыр люка, пад якім ацяпляльныя трубы. Жалезныя скрыні са сьмецьцем упершыню апанавалі не каты, а птушкі. Каля адной — дробныя вераб'і, каля наступнай — вароны, каля трэцяй — ахайныя чысьцёхі галубы. Сталоўка. Толькі што ты некалькі разоў перачытаў няўцямны надпіс, які табе па-беларуску раіў: "бяры хлеб па спажываньню"(?). Атавізмы сувэрэнітэту ў гандлі.

Сабакі са сьнежнымі пысамі разграбаюць сьнег нібы лясныя вепрукі. Гульня, пошукі? Крыху раней. Сабачка з захапленьнем, хочацца сказаць — са шчанюковаю радасьцю, ганяе па заледзянелым доле надзвычай лёгкую пустую плястыкавую бутэльку. Ці ўпершыню ты палюбіў варонаў, сарок, груганоў? Усё адно. Паважны выгляд пры сьмешных каротkіх і калматых нагавіцах, якія перашкаджаюць скакаць па сьнезе. А галоўнае, годнасьць і зусім не глупота ў вачох. Немаведама што прымусіла клясыка пагардліва сказаць "дурны мужык як варона". Штосьці ён пераблытаў.

2.

Даляр расьпінае ў зьмірэнчай кашулі.

Тры "Беларусі" ўгодліва расчышчаюць ад сьнегу пляц перад адубелым Ленінам, быццам 8-га сакавіка таксама адбываюцца мітынгі. На стомэтровай вуліцы ледзьве пасьпелі зьмяніць шыльдачкі. Замест К.Цэткін — Дамініканская. Тут рэдакцыя беларускай газэты "Пагоня", зернейка якой захавалася нібы апісаная клясыкам пшаніца ў эгіпэцкай пірамідзе.

Недзе далёка расейцы разбурылі спалены гмах прэзыдэнцкага палацу, недзе чачэнскія партызаны раптоўна апанавалі захопленую год таму рэгулярнымі войскамі сталіцу. У Лідзе рэгіянальная канфэрэнцыя БНФ патрабуе ад Пазьняка, каб згадзіўся на збор подпісаў за лукашэнкаву адстаўку.

Апэтытна чырвоны аўтафургон Coca-Cola спыніў рух на вуліцы Леніна Мікалая, ніяк з-за сумётаў ня можа збочыць да орсаўскае крамы. Даўгі хлапец у чырвона-фургонным камбінэзоне і бэйсболцы на мігі просіць перачакаць дзьве чадныя кавалькады, якія сьпяшаюцца ленінскім шляхам у адваротныя бакі.

Замежны сэдан — аграмадны пачак з-пад стымаралу, дакладна паўтарае малюнак жуйкавае абгорткі. Два міліцыянты цікавяцца, чаму frech-maker прыпаркаваў сваё стракатае дзіва каля насатага маршала, зробленага на матыў галавы стода зь Велікоднае выспы. Абцятая па плечы маршальская галава высока на пастамэнце, і не зважае на жыццёвыя дробязі.

3.

Камунальныя брыгады разьяжджаюць па горадзе, аббіваючы з падстрэшкаў калёніі ледышоў.

Амаль палова сакавіка. Пануе клясычная зіма. Стары горад у сьнежным палоне. Абодва замкі патанаюць у сумётах. Асабліва Новы, дзе сьнегу больш месца. Даўней, калі сюды хадзілі на сваю партыйную працу сакратары ды інструктары абкаму, сьнег у горадзе перш вывозілі адсюль. Цяпер жа яшчэ адзін сьнегапад і, здаецца, каралеўскі палац стане недаступны для студэнтаў са школьнікамі — чытачоў ды экскурсантаў. Каб непаважныя аматары рыгліьпірмінту не чапалі вязіныя першадрукі вялікай французскай энцыкляпэдыі, якая неспадзявана падрыхтавала рэвалюцыю, таксама вялікую і французкую. Ці вы чытаеце па-французску, ці разьбіраеце тагачасны гатычны шрыфт? Энцыкляпэдычныя фаліянты выпадкова захаваліся, і таму іх не давялося падрабляць у сваёй майстэрні У.К., які ратаваў прагалы экспазыцый муляжамі.

Хай сьпяць спакойна рыцарскія латы, партрэты Касьцюшкі і Панятоўскага, янычарскі ятаган, самурайскі меч ды вітыя інданэзійскія кінжалы, мясцовыя кавалерыйскія шаблі, прывабна-незразумела зваexisting кабабзяй. Халера і з вамі, акупацыйныя салдацка-суворaўскія шапкі, якія сьпятрэлі і сьцяліся да дзіцячага памеру нібы муміязаваныя галовы прабадырою папуасаў і пралетараў.

Перад замкавай брамаю — стылёва неадпаведны драўляны трох- ці чатырохмэтровы Вітаўт-ас аўтарства нейкага літоўскага, здаецца, віленскага разьбяра. На плячох сьнежныя гурбачкі, як уяўныя пагоны. Выпадковы напамінак пра зрабаваную палякамі карону, якой ён не дачакаўся. Па адзіным у сёньняшняй Беларусі выгбавым мосьце пераходзіш у колішнюю Вітаўтаву рэзыдэнцыю. Каб абавязкова пастаяць на паўразбураным муры высока над Нёманам.



Успамінаецца іншы дзень. За ракою золкая марозная смуга, да якой нехта прыляпіў бляклую плямку зімовага сонца. Белая паверхня замерзлай ракі сьпярэшчана мудрагелістымі ланцужкамі сьлядоў. Каля прычалу прымерз да лёду невялікі цеплаход. Цяпер сьлядоў ня бачна. Час-часам сыплецца сьнег. Штодня. Абапал рэчышча уздоўж берагоў пазначыліся цёмныя пісягі — непазьбежны ўплыў цёплага расьпешчанага гарадзкога жыцьця. Першая прыкмета будучай неадлігі. Неўзабаве нельга будзе перакрочыць гэты ваш Кранон. Раку часу? Ці — бясчасу? Міжчасу...

4.

А ў Тайвані вучэньні грамадзянскае абароны. Кітайцы начыталіся невядомага рамана Аксёнава. Асабліва ім спадабаўся фінал, страляюць у тайваньскі бок балістычнымі ракетамі. Але тайваньцы ня лыкам шытыя, яны таксама чыталі "Востраў Крым". Паназіраць за тэатрам вайсковых дзеяньняў прыплыў авіяносец Independent. Сымбалічная і разам двухсэнсоўная для гэтага выпадку назва.

5.

Горы, невысокія, з касьцёламі, замкамі, хрушчоўкамі, бронзавай статуяй у пудовай кепцы і падземнай грамадзкай прыбіральняй на адрасе Савецкая плошча 1а набрыньваюць блізкай і вельмі вялікай вадою. Гару пад Каложай, гавораць, абавязкова падмые. Дальбог. Начальства гавора. З панядзелка, нібыта, пачнуць умацоўваць. Як, цікава? Ды хоць бы як. Праваслаўная ж сьвятыня! Што Лукашэнка Алексію скажа, калі падмые? Падмываць можна хіба што касьцёлы... Так, праваслаўная, затым уніяцкая Каложа, як толькі была зроблена расейска-праваслаўнай —абрынулася ў Нёман. Амаль палова храма. У вялікую паводку 1853 году. Так і зь Беларусяй будзе, калі вернуць яе назад у расейскую няволю. Толькі-толькі ў Калоскай царкве пачалі майстраваць новы аўтар...

Вы ідзяце зь бюракратычнай установы са зьвесткамі пра будучую паводку. Яны гучаць апакаліптычна. Збочыўшы з вул. Ажэшкі на Савецкую, пешаходную — за царом Мураўёўскую і Дамініканскую — бачыце, як насустрач едзе колеру лётасу Opel Ascona. За рулём калоскі бацюшка! Сьпыняецца і расчыніўшы па-джэнтэльмэнску дзьверцы выпускае ў бок вуліцы Сьветлае будучыні прывабную даму.

Далёка у сьнягох капаюць вакол калгаснае вёскі доўгі беламорскі канал сямімэтровае шырыні. Каб вёску ня змыла. У навакольных гарадах і мястэчках не пасыпаюць больш вуліцы салёным пяском. Тысяча мяшкоў зь ім прывезена ў вёску, каб умацаваць дамбу. У невялікім горадзе Б. з жахам чакаюць, калі шкодныя сьцёкі з ачышчальных ставоў вялікага заводу імя першага прэзыдэнта зноў залілюць аднапавярховую Беларусь: хлеўчукі з парсюкамі, скляпы з бульбай і шматамі сала, дрывотні, хаты, якія пачалі расьці ў зямлю, разам з тэлевізарамі, у якіх бясконцыя лукашэнкавыя маналёгі...

А вось вы стаіце ў кавярні за столікам з клюмбаю штучных кветак. Калега ўспамінае бацькоўс-

# ПАТОП

кую хату ў мясьцінах з сольнакалійнымі гарамі й шахтамі. Уся вёска атрымала загад на эвакуацыю. А ў хаце кніжкі. А пад зямлёю запампаваны туды калійны шлям. Ты міжволі ўяўляеш, як уздымаецца ўсё гэта хімічнае пазадзьдзе з талай вадою, як з тысячаў фэрмаў расьцякаюцца на усе бакі фэкі, як калгасныя ядахімікаты... Што задумаўся? Пі сваю каву, дзядзька.

Каля небясьпечнага тэлефону ў штабе грамадзянскай абароны дзяжурыць палкоўнік з груваcткім расейскім прозьвішчам Шароў, але нечакана беларус. Балятаваўся палкоўнік у парлямэнт, каб падзяліцца з дэпутатамі штабным досьведам, але не атрымалася.

Група падрыўнікоў назапасіла дынаміту. Ім давядзецца глушыць рыбу пад 60-сантымэтровым лёдам. У трох шрубалётаў напагатове, у перадчуваньні адказнае працы, прапэлеры. Перш аглушаць, кантузяць, згвалцяць і закатуюць (ці вызваляць) Нёман, але спачатку Нямунас — з таго боку мяжы. Паводле дамовы на ўзроўні прэм'ер-міністраў. З асабістай згоды прэзыдэнтаў, якія, разабраўшыся з агульным гербам, разьбяруцца і з агульнай ракою. Яна, паводле іх плянаў, павінна стаць транспартным калідорам на выпадак экстрэмальнае сытуацыі, для вываду атамнага падводнага флёту з плаўбазы г. Балтыйску ў родную савецкую Беларусь, якая павінна стаць апэндыксам для канцэнтрацыі фэдэральных войскаў перад абліччам наступу НАТО на ўсход. Па-над ракою сям-там вісяць газаводы-дружбы. Ня дай бог лопнуць ад марозу ці, наадварот, ад крыгалому, што тады з інтэграцыяй?! Рачныя масты атрымалі ахову, якая напрасткі падначальваецца асабіста самому галоўнаму камандзіру.



Здымак Анатоля Клешчука

6.

Каналы Агінскага. Гэта той, што палянэзы прыдумаў? Ці яго сваяк? Ці, можа, сваяк сваяка? Якая вам розьніца! Ну як жа якая? Яго разьвітаньне з радзімаю спадзяваліся зрабіць гімнам РБ, пакуль справа ня ляснула з-за першага прэзыдэнта, які пад настрой сьпявае толькі “саюз нерушымы...” А каб не лайдачылі лішне й зрабілі?

Агінскія каналы набрыньваюць, як жылы, ламаюць лёд, затапляюць горад, перапыняючы электрычнасьць і водападачу. Эвакуяваных жыхароў селяць у кашарах на вул. Чырвонаармейскай, разьмяркоўваюць паміж імі службовыя нарады і кормяць з паходных кухняў.

7.

Генэрал Грыб усхвалявана прамаўляе з трыбуны сэсіі. Ягоны родны раён засыпаны сьнегам, землякі ў вёсках адрэзаны ад жыцьцёва неабходнай інфармацыі. Ён просіць прэм'ера ці нават самога прэзыдэнта (?!) забясьпечыць сялянаў у глухіх вёсках радыёдынамікамі з намаляваным на іх залатымі літарамі прэзыдэнцкім подпісам...

А дзятлаўскі райвэртыкалькам прымае гістарычнае рашэньне аб адлове й зьнішчэньні валацужных сабак, якія “палохаюць, кусаюцца і распаўсюджваюць хваробы”. Найлепшыя галовы прыдумваюць дакладнае вызначэньне для валацугаў — усе, якія без гаспадара. Кантора ЖКГ атрымала загад стварыць першую спэцбрыгаду. Другую спэцбрыгаду, узброеную да зубоў “для адлову і зьнішчэньня ваўкоў, лісіц і іншых драпежных зьвяроў”, пажарным чынам фармуе таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Не маглі дачакацца, каб той Грыб выбіў з ураду бясплатныя факсымільныя прыёмнікі для жыхароў лясных сялібаў, каб тыя маглі адганяць зьвяр'ё гучнымі радыёманалёгамі! А можа ў гэтым таксама праявілася супрацьстаяньне выканаўчай і заканадаўчай улады? O tempora, o mores!

8.

Жоўты грэйдар соўгаецца па сумётных дварох, чысьціць дарогу для машынаў са сьмецьцем. На дзьвярах пад'езда вузкі пасак аб'явы: забясьпечце свае прадукты і маёмасьць у падвалах перад паводкай. Ужо пяць дзён як перад Леніным ніяк не разграбуць гурбы, “Беларусі” замянілі большым “Кіраўцам”. У газэце лілёвая абвестка: “Милые дамы, база “Бакалея” поздравляет с праздником...”

9.

80 вёсак рыхтуюцца да эвакуацыі, некалькі тысячаў вяскоўцаў. Амаль павыміралі вёскі. 22 фэрмы і 12 тысячаў жывёлаў таксама чакаюць адсяленьня. У заапарку вакзальныя настроі. Заапарк конча будзе затоплены. Зубар, натуральна, мог бы назад вярнуцца ў пушчу. І суматранскі тыгар зь ягарам і сьнежным барсам. А вось кітайскаму алігатару, чорнаму насарогу, афрыканскаму слану і бэгемоту наўрад ці спадабаецца парапоўненая вадою Гараднічанка, якая прабіраецца цераз горад у Нёман, у які трапляе каля самое Каложы. Іх усіх разьвязуць па навакольных калгасах, на жывёлагадоўчыя фэрмы — у “Прагрэс”, “Кастрычнік” і былы “Шлях да камунізму”. Патрэбна ажно 500 клетак, а іх няма. Можа ў менскім цырку пазычаць? —спадзяецца вэртыкальнае начальства, якому шкада 500 мільёнаў на клеткі. Што зь імі потым рабіць? Хіба што каго-небудзь саджаць.

10.

У Ашмянах угодкі Сталіна адзначылі аблавай на бедных беспрытульных сабак.

11.

Алесь А. апавядае сон: гляджу з 15-га паверху на Нёман, а па ім плыве цэркаўка драўляная, менавіта праваслаўная, бо з цыбулькай. Выглядае, як палеская. І бярэ мяне жах: значыцца, неўзабаве і хаты паплывуць... А ты стаіш, слухаеш і міжволі рэагуеш ланцугова: Чарнобыль—нібы-сувэрэнітэт—першы прэзыдэнт—усенародны рэфэрэндум—біблейскі патоп...

*13 сакавіка*

**ЗАНАТОЎКІ ЭГАІСТА**

*Адам Глёбус*

# Нетрадыцыйныя задавальненьні

Раней, усе свае трыццаць пяць гадоў, я ніколі не прымаў раніцой ванну, а вось прывык, і мне няўтульна безь пяціхвіліннага ляжаньня ў цёплай вадзе і менавіта зранку.

*



І яшчэ пра ванну...

Прачытаў у швэйцарскага немца Макса Фрыша, як чалавек, несправядліва абвінавачаны ў забойстве, клаўся ў поўную ванну, адчыняў вадасьцёк і чакаў пакуль сьцячэ ўся вада аж да апошняй кроплі. У Фрышаўскім герoі мне ўбачылася ўрбаністычнае прачытаньне традыцыйнага — а каб яно (гора!) сплыло разам з вадою.

Некалькі разоў у цяжкія дні я й сам набіраў поўную гарачую ванну, каб разам з вадою зь мяне ў чорную адтуліну сьцякло й гора горкае.

*

У часе скрухі можна суцешыць сябе думкаю — ты робіш столькі зла, колькі ворагі робяць табе. Суцяшэньне варта шукаць у раўнавазе.

*

Перад тым, як выйсьці з дому, выбіраю непатрэбную рэч і выкідаю ў сьмецьцеправод. Звычайна гэта часопісы, газэты й пустыя бутэлькі, але ўчора выбраньніцаю была шэрая кепка, яе выкідаў са шкадобаю.

*

Калі ў пакой, дзе няма нічога жывога, прынесьці гаршчэчак з кветкаю, дык, засяродзіўшыся, можна ўбачыць, як жывое прыцягне й сканцэнтруе на сабе ўвагу ўсяе пакаёвае прасторы ды ўсіх пакаёвых рэчаў. Калі ж у той самы пакой прынесьці два гаршчэчкі з кветкамі, можна ўбачыць і барацьбу, бойку глядыятараў. І калі я назіраў за паводзінамі кветак, дык пераканаўся: бой глядыятараў зусім не вынаходніцтва чалавека, а праява прыроды. ЖУК ЕСЬЦЬ ТРАВУ, ЖУКА ЗЬЯДАЕ ПТУШКА, А ТХОР П'Е КРОЎ З ПТУШЫНАЙ ГАЛАВЫ... Але асноўнае ў іншым. Побач з кветкаю ўсе рэчы здаюцца падпарадкаванымі й мізэрнымі. І таму лягчэй пазбавіцца ад палону рэчаў.

І яшчэ... Я доўга ня мог зразумець, чаму мая котка загрызла кавовае дрэўца, а цяпер ведаю — з-за рэўнасьці.

*

Слухаючы магнітафон у машыне, заўважыў, што прыносіць асалоду ня столькі слуханьне музыкі, як услухоўваньне ў яе.

*

У часы майго дзяцінства запалак на вуліцах валялася процьма. І ў веснавы сонечны дзень я выходзіў са школы, падыходзіў да ручаіны, што бруілася каля броўкі і пускаў запалку. Яна плыла, абмінаючы камяні і гурбы сьнегу, яна зьнікала пад ледзянымі карункамі й вынырвала зноў на іскрыстыя хвалі... Бязь сьпешкі я крочыў уздоўж ручаіны і сачыў за вандроўніцаю-запалкай. Калі яна спынялася, зачапіўшыся за які ашмотак газэты ці пачак з-пад цыгарэт, я дапамагаў ёй вызваліцца і мы працягвалі падарожжа, аж датуль, пакуль ручай не расплываўся ў вялікай лужыне ці не правальваўся паміж кратамі ў вадасьцёк.

Цяпер згарэлую запалку ня надта знойдзеш нават на прыпынках. Усе карыстаюцца запальнічкамі, а іх ня пусьціш па веснавой ручаіне.

*

Найвялікшае задавальненьне атрымліваю падчас выкрываньня сакрэтаў. Недзе нехта нешта прытойваў, хаваў, маскаваў, а я ўзяў і ўбачыў і паказаў усяму сьвету. Вось так высочваеш у краявідзе хамэлеона. Глядзіш, напружваесься, пільнуеш і раптам — радасьць. Хрыбетнік, лапы, хвост, вочка міргнула. Хваляваньне немагчыма стрымаць. Вядома, асудзяць... Як ты мог?.. Людзі кажуць!.. Дзе сумленьне?.. Што ён, хамэлеон, табе кепскага зрабіў? За што? Цэлая гурба нікчэмных пытаньняў. Я ўбачыў хамэлеона, узрадаваўся і паказаў яго сябрам. На душы ўтрая весялей, калі радасьць адкрыцьця бачаць сябры.

сучасная ЛІТАРАТУРА




Кніга стала прадаецца ў наступных пунктах:

У МЕНСКУ: у шапіку ТБМ (каля Нацыянальнага Банку), у Літаратурным музэі М.Багдановіча (вул. Багдановіча 7а) і ў фае Нацыянальнае бібліятэкі;

У ГОМЕЛІ: у аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў абласной бібліятэкі;

У ГОРАДНІ: у шапіку “Васілёк” (каля ўнівэрсытэту);

У МАЛАДЭЧНЕ: у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале).

У іншых выпадках раім зьвяртацца да сыстэмы “Кніга-поштай”. Для гэтага трэба 41.000 БРБ пералічыць на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. Не забудзьцеся падаць свой адрас.

### *Салідарнасьць*

4 красавіка рэдакцыя "НН" атрымала праз факс Заяву Палітычнае Рады Канфэдэрацыі Незалежнай Польшчы (KPN). Канфэдэрацыя — адна з буйных парлямэнцкіх партый суседняй дзяржавы. "У сувязі з падпісанымі прэзыдэнтамі Беларусі і Расеі 2 красавіка пагадненьнямі, якія азначаюць фактычную ліквідацыю сувэрэннасьці Беларусі, Палітычная Рада KPN заяўляе наступнае:

1. Рашэньне пра "паглыбленьне інтэграцыі" азначае для Беларусі адмову ад яе незалежнасьці, г. зн. ад бясцэннай каштоўнасьці, ад якой ня можа адмовіцца ніводзін урад, бо гэта ўласнасьць народу.

2. Паглынаньне Беларусі Расеяй — гэта чарговая праява адраджэньня расейскай імпэрыі, якая пагражае бясьпецы краінаў Сярэдняй Эўропы, у тым ліку Польшчы.

3. Мы заклікаем усе польскі грамадзкія і палітычныя сілы падтрымаць беларускі незалежніцкі рух".

Мы добра ведаем, што такое жыць без незалежнасьці і ні пра што такое ня думаць. Цяпер нам давядзецца спазнаць — што такое жыць пазбаўленымі незалежнасьці. Палякам вельмі добра вядома, што гэта за жыцьцё. Іх досьвед і ўменьне цаніць незалежнасьць могуць стацца для Беларусі вялікай падтрымкай.

### *Вітаю стваральнікаў "Нашае Нівы".*

Мне 16 гадоў і я ваш сталы чытач. З таго часу, як "НН" была адноўленая ў 1991 годзе, я не прапусьціў ніводнага нумару.

Ваша ранейшая ўзьнёсласьць і летуценнасьць адпавядала той пары. Падчас знаходжаньня Шушкевіча на пасадзе сьпікера ў нас усіх быў той пэрыяд, калі мы мроілі і спадзяваліся, што, нарэшце, пабудуецца наша "Каралеўства Беларусь". Але чым далей, тым больш рабілася зразумела, што Беларусь — гэта "мёртвы дом", "перакулены конус з цэнтрам у Менску".

"Наша Ніва" намагалася адукоўваць беларусаў, маючы высокія мэты. Якія былі ўзьнёслыя нумары пра Менск, навагодні нумар, цалкам надрукаваны лацінкай! Колькі беларускасьці было схавана ў кожным радку! Газэта стварыла сабе імідж элітарнага гісторыка-культурнага выданьня. Але гэта звузіла кола яе чытачоў да тых, чый сьветапогляд супадае зь сьветапоглядам рэдакцыі. Такіх людзей аказалася няшмат. Хтосьці перастаў выпісваць газэту з-за мэнтальнай дыстанцыі і занадта альтэрнатыўнага нашаніўскага падыходу да ўсяго. І вось вынік — трэба штосьці зьмяняць. Сярод нас, сталых чытачоў, знойдзецца шмат скептыкаў (адзін зь іх — мой бацька), якія будуць абвінавачваць новы варыянт газэты ў адсутнасьці тых пэрлінаў, што грэлі вока ў папярэдніх нумарах. Я сам любіў гэны дух, што вітаў нас у "Ленцы", "Эсэ пра Зарэчча", "Забі сьвіньню" і інш.

Мой бацька лічыць, што было б файна, каб вы кампэнсавалі зьмену штомесячным літаратурным выпускам. Не забывайцеся на вершы. Калі ёсьць добрыя, надрукуйце! Я і сам пішу і цікаўлюся літаратурай.

Але, спадары скептыкі, успрымайце крок "Нашай Нівы", як чарговую цагліну ў адраджэньне нацыі, прыцягненьне да беларушчыны шырэйшага кола чытачоў!

Добры дадатак "Інфарматар". Цікава было б даведацца, як там бытуе MTV. А таксама не спыняйце друкаваць сусьветныя хіт-парады. Таксама "Наша Ніва" магла б друкаваць першы штотыднёвы беларускі хіт-парад. Гэта маглі б зрабіць і ў радыё 101'2. На жаль, ня маю магчымасьці слухаць.

Адным словам, усё цудоўна!

*Ваш чытач Храпавіцкі Андрусь, Глыбокае*

### *Найшаноўная "Наша Ніва"!*

Быў адчувальна кранугы "цыганскаю" публікацыяй у "НН" журналіста С.Адамовіча. Як дадатак і сьведчаньне майго першаадкрывальніцтва ў тэме друйскіх цыганаў, дасылаю сваю "Цыганку", намаляваную ў Друі ў 1989 годзе.

*Алесь Мемус, Віцебск*



### *Добрага здароўя, "НН"!*

На правах вашага старога няўдалага аўтара віншую з новым тварам, а дакладней — таварам. Тавар, можна сказаць, спажыўны і, мне здаецца, пэрспэктыўны. Жадаю вам стаць сапраўднай выдавецкай карпарацыяй. Спадзяюся, што ваш рэклямны дадатак зь цягам часу стане першым самастойным "дзіцём", якім вы так пасьпяхова зацяжаралі. Адно толькі — імя ў яго сумнаватае, аддае нейкім кадэбісцкім душком. Я прапаную (ці дакладней —прадаю, пакуль бясплатна) іншую назву — Інфар-мікст (infor-mixt), у якой лацінскае "mixt" азначае "сумесь", "кактэйль", "мікстура". Посьпехаў у плаваньні па дзікіх хвалях рынкавага сацыялізму.

*В.Аўраменка, Магілёў*

### *Няясная сталіца*

Гледзячы на палітычнае жыцьцё Беларусі з часу аднаўленьня незалежнасьці і на тыя палітычныя плыні, што змагаюцца ці змагаліся за права кіраваць краінай і тых людзей, якія іх падтрымваюць, міжволі задаеш сабе пытаньне: у якой дзяржаве мы жывем, дзе наша сталіца? Дакладнага адказу не знаходзіцца. Падобна на тое, што ўласна з краінай Беларусяй, са сталіцай горадам Менскам сябе мала хто атаясамлівае. Грамадзтва яшчэ не ўсьвядоміла тую палітычную сытуацыю, якая склалася пасьля Белавескіх пагадненьняў 1991 году.

Апанаваўшы нацыянальную ідэю, Народны Фронт, відаць, па-ранейшаму бачыць Беларусь ня ўласна Беларусяй, а Вялікім Княствам, натуральна, са сталіцаю ў Вільні, зь межамі ад мора да мора і, напэўна, марыць прыхіліць дзіду Альгерда да маскоўскае брамы. Хоць непасрэдна пра гэта й не гаворыцца.

Што тычыцца Лукашэнкі, які скарыстаў момант і апынуўся на вяршыні ўлады, а таксама тых, на каго ён абапіраецца, г. зн. найменш адукаванай часткі насельніцтва, то яны жывуць у СССР ад Буга да Курылаў са сталіцаю ў Маскве. Ні Лукашэнку, ні ягонаму электарату няма аніякае справы да Беларусі. Менск не ягоная сталіца, гэта відавочна. Ягоны час у Беларусі мінае. Ён гэта разумее і пайшоў ва-банк, хоча далучыць Беларусь да СВАЁЙ сталіцы. А тая частка насельніцтва, якая да канца будзе яго падтрымваць, — гэта плебс, якому ўсё адно, дзе жыць, галоўнае, каб нешта дзяліць і даваць выхад сваёй злосьці. Беларусь ня іхная краіна, Менск ня іхная сталіца.

Бальшыня ж насельніцтва лічыць сябе па-ранейшаму тутэйшымі. Прывязаныя да свайго дому, яны гэты дом і лічаць сваёй краінай і сталіцай, і за гэты дом яны будуць змагацца да канца. Менск, Вільня, Масква альбо Варшава для іх — гарады і больш нічога.

Хто ж рэальна жыве ў Беларусі і адназначна ўважае Менск за сталіцу сваёй краіны? Апрача нацыянальна сьвядомых людзей, гэта кляса бізнэсоўцаў і прыватнікаў, незалежна ад нацыянальнасьці, якія выразна бачаць сваю пэрспэктыву — найперш бізнэсовую, па-другое, пэрспэктыву рэалізацыі сябе як асобы толькі ва ўмовах дзяржаўнасьці Беларусі. Яны разважаюць катэгорыямі выгады. Быць ці то ў эСэСэСэРы, ці то пад Расеяй ім нявыгадна. Яны будуць адстойваць можа й не Беларусь, але свой бізнэс, а гэта зь іхнага гледзішча, рэчы аднолькавыя. Менск, дзе пакуль што вырашаюцца іх жыцьцёвыя праблемы, — іх сталіца, іх горад. Тое самае датычыцца большае часткі дзяржаўнае бюракратыі і намэнклятуры, якая адчула смак жыцьця (хоць крыху) у незалежнай дзяржаве, а гэта зусім нямала. І тут назва партыі вялікага значэньня ня мае. Гэта менавіта той асяродак, для каго Менск — рэальная сталіца рэальнай краіны.

І сёньня мы назіраем, што менавіта гэтыя колы думаюць пра абарону дзяржаўнасьці і незалежнасьці, пра пабудову сваёй краіны. Цяпер дзеля гэтага давядзецца зрабіць значна больш намаганьняў. Але як кажуць — досьвед прыходзіць з гадамі, як і заробак.

І апошняе, у 1918 годзе 25 сакавіка БНР была абвешчана менавіта ў Менску. Што тычыцца Вільні, то ў складзе якой бы дзяржавы яна не знаходзілася, яна застанецца местам нашай духоўнасьці. Рукапісы не гараць. Масква была, ёсьць і будзе чужым для Беларусі горадам, але гэта ўжо іншая размова.

*Алег Дашкевіч, Менск*

## ФОТАЗАГАДКА



1

Штотыдзень на апошняй старонцы "НН" мы будзем публікаваць здымкі з фрагмэнтамі розных краявідаў нашых местаў ды мястэчак. Вы мусіце назваць тое, што выяўлена на гэтых здымках.

Той, хто слушна адкажа на пяць загадак запар і дашле свой адказ на адрас рэдакцыі, атрымае каштоўны прэзэнт. А той, хто адкажа першы, атрымае і самае каштоўнае, што ў нас ёсьць — "Нашу Ніву" на ўвесь год.


NESCAFÉ
CLASSIC



| | | |
|---|---|---|
| SELECT | 100/48 | 1.6$ - 1.75$ |
| CLASSIC | 250/12 | 4.05$ - 4.2$ |
| BRASELLO | 110/12 | 2.20$ - 2.35$ |

МІНІМАЛЬНА —1 КАРОБКА
ПРЫМАЕМ ЗАМОВЫ
ТЭЛ.(0172)626141
Nestlé



пытайцеся ў шапіках
"Саюздруку"
і ў прыватных
распаўсюднікаў,
а яшчэ лепш – выпісвайце
НЕЗАЛЕЖНЫ ТЫДНЁВІК
НАША НІВА



наш індэкс 63125
Падпіска праз недзяржаўную сетку дастаўкі
тэлефон 29-22-10 (Цыбульскі Леанід).


© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5000 Нумар падпісаны ў друк 7.04.1996 Надрукавана ў ЗАТ "Lietuvos Rytas" (Вільня, праспэкт Гедыміна, 12а)